№ 45 (547) 6 сьнежня 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

**У НУМАРЫ**

## Высока пастаўленыя сваякі

Бацькі могуць супернічаць, а дзеці міла працуюць пад дахам аднаго ведамства. «НН» пісала пра бліскучыя дыпляматычныя кар'еры Захара Навумава, сына міністра ўнутраных справаў, і Андрэя Сухарэнкі, сына былога старшыні КДБ. Дзеці двух «сілавікоў» далёка не адзіныя сваякі былых і сёньняшніх высокіх чыноўнікаў, якія працуюць у структуры Міністэрства замежных справаў? Поплеч зь імі замежнапалітычныя інтарэсы Беларусі адстойваюць дзеці Макея, Ерына, Лінга, жонкі Камянкова, Сьвержа і многіх іншых высокіх урадоўцаў. **Старонка 16.**



# Чаго ён едзе?

Прэзыдэнт Расеі прыяжджае ў Беларусь аж на два дні за трое сутак да зьезду «Адзінай Расеі», на якім мае быць абвешчаны сцэнар пераемнасьці ўлады. Старонка 3.

## Каляндар

са здымкамі фатографаў «НН» Юліі Дарашкевіч і Андрэя Лянкевіча.




### Візыт Лукашэнкі ў Вэнэсуэлу зрываецца?

У аўторак дарадцы А.Лукашэнкі на чале зь Віктарам Шэйманам спрабавалі прадказаць ход падзеяў за акіянам. **Старонка 4.**

### Музыкі вяртаюцца на афіцыйную сцэну

Анансаваныя выступы Neuro Dubel-ю, вялікія канцэрты «Крамбамбулі» і праекту «Народны Альбом». **Старонка 5.**

## Ці пагражае рублю дэвальвацыя

альбо Дзе трымаць свае мільёны простаму чалавеку? Піша **Аляксандар Чубрык**.

Пры канцы мінулага і ў студзені гэтага году ўсіх, хто меў хоць якія ашчаджэньні, тым больш рахунак у банку, насьцярожыла адна чутка: будзе дэнамінацыя беларускага рубля! Што такое тая дэнамінацыя, памяталі, відаць, ня ўсе, ды слова надта страшнае.

**Працяг на старонцы 11.**

## Ці зьбіраюцца незалежніцкія сілы арганізоўваць пратэсты супраць візыту Пуціна ў Беларусь?

**Лявон Баршчэўскі:** «Візыт Пуціна ў Менск — трывожная навіна. Сустрэча будзе двухдзённай, гэта значыць, што нейкія пытаньні будуць вырашацца ноччу, а ў цёмны час робяцца толькі нядобрыя справы. Пуцін, найхутчэй, будзе спрабаваць прыціснуць Лукашэнку і пайсьці на ягоныя ўмовы. А іншай канцэпцыі, як уваходжаньня Беларусі ў склад Расеі, у Крамля няма. Шмат ужо хто забыўся на маніфэст Сініцына і Парфяновіча пра ўваходжаньне нашай краіны ў Расею, але ёсьць людзі, якія гатовыя зьдзейсьніць гэты плян. Пратэставаць безумоўна варта».

**Сяргей Папкоў:** «Мы ня можам ведаць, пра што будуць гаварыць Пуцін з Лукашэнкам. Гэта нейкія мышыныя дамоўленасьці. Такія візыты ніколі не прыносілі нічога добрага. Пагроза беларускай незалежнасьці існуе ад 1994 году. Калі ёсьць рашучая моладзь, якая гатовая пратэставаць падчас гэтых перамоваў, то мы гатовыя іх падтрымаць».

**Іван Шыла:** «Акцыі пратэсту ладзіць, безумоўна, патрэбна. Нешта падобнае «Малады фронт» ужо рабіў летась падчас саміту кіраўнікоў дзяржаў СНД у Менску».

**Вячаслаў Сіўчык:** «Я баюся гэтага візыту, бо ніхто ня ведае, дзеля чаго Пуцін едзе ў Менск. Гэтага ня ведаюць ні ва ўладных колах, ні ў апазыцыйных. Мяне насьцярожвае, што гэтая сустрэча будзе адбывацца напярэдадні лёсавызначальных для Расеі падзей — зьезду «Адзінай Расеі» і першага паседжаньня новага складу Дзяржаўнай Думы. Думаю, што ў менскай сустрэчы можа быць некалькі канчатковых варыянтаў разьвіцьця — ад нэўтральных да вельмі сумных для Беларусі, яе незалежнасьці. Калі ёсьць магчымасьць, то акцыі трэба ладзіць, як напярэдадні візыту, так і падчас яго».

**Апытаў Зьміцер Панкавец**

КАМЭНТАР

## «Праблема Казуліна» вуснамі Лукашэнкі

У гішпанскай газэце «Паіс» зьявілася інтэрвію з А.Лукашэнкам. Адзін з самых інтрыгоўных момантаў: Лукашэнка заявіў, што гатовы разгледзець пытаньне аб памілаваньні Казуліна, калі той яго папросіць. «У нашым Крымінальным кодэксе няма палітычных злачынстваў. Мне ня важна, хто ён. А калі нейкая асоба фармуе банду і штурмуе турму… Суд прыняў рашэньне. Гэта незалежная галіна ўлады. Я паважаю яго рашэньне. Адзінае, што я магу зрабіць, гэта памілаваць яго. Калі асуджаны пра гэта папросіць, я вывучу ягонае прашэньне і пасьля скажу, ці вызваляю яго», — цытуе Лукашэнку «Паіс».

Цяжка прагназаваць, якое было б рашэньне ў такім выпадку. Але яшчэ цяжэй уявіць, што Казулін напіша такую паперу.

**Аляксандар Класкоўскі**

# Настасься Мацяш: «Карлсан» — гэта хіт некалькіх пакаленьняў

Паводле вынікаў галасаваньня на званьне «Чалавека лістапада» перамаглі выдаўцы «Карлсана-з-даху». У апытаньні на сайце назіраліся падкруткі галасоў за рок-музыкаў і Аляксандра Радзькова, але гэтыя галасы былі зьнятыя з канчатковых вынікаў. На некалькі пытаньняў «НН» адказала адна з ініцыятарак выданьня «Карлсана» па-беларуску **Настасься Мацяш**.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«Наша Ніва»: Чаму менавіта «Карлсан»?**

**Настасься Мацяш:** Беларуская паліграфія вельмі магутная, у гэтым можна пераканацца ў кожнай менскай кнігарні. Разам з тым, напаўненьне і якасьць многіх кніжак, асабліва дзіцячых, пакідае спадзеў на лепшае. Прабачце, але я нават дзіўлюся, хто гэта ўсё чытае. Усе гэтыя вавёркі, зайчыкі, вёска малацікавыя сучасным дзецям. «Карлсан» — гэта хіт некалькіх пакаленьняў. Гэтую кнігу некалі мне чытала мама, пасьля я чытала яе свайму сыну. Перакананая, што і сын будзе яе чытаць сваім дзецям. Нейкім чынам мы хацелі далучыць нашыя культурныя здабыткі да сусьветных. Таксама ёсьць спадзеў, што гэтая кніга падштурхне іншых выдаваць кнігі на належным узроўні, ня толькі вонкава, але і ўнутрана беларускімі.

**«НН»: Наколькі цяжка было ажыцьцявіць гэты праект?**

**НМ:** Цяжка, як усё, што робіцца ў першы раз. Ніякага досьведу ў выдавецкай справе ў нас з Алесем Яўдахам яшчэ не было. Разам з тым, мы пайшлі самым цяжкім шляхам. Кніжка выйшла з ілюстрацыямі, у колеры, нават з аўтарскімі правамі разабраліся. Можна было зрабіць усё прасьцей, але тады прадукт аказаўся б не такім якасным. Мы таксама вельмі ўдзячныя выдаўцу Зьмітру Коласу, які дапамог нам зрэалізаваць гэты праект.

**«НН»: Калі адбудзецца афіцыйная прэзэнтацыя кнігі?**

**НМ:** Прэзэнтацыя пройдзе 19 сьнежня ў Пушкінскай бібліятэцы а 18:00. Ня хочацца загадзя раскрываць усе цікавосткі імпрэзы. Скажу толькі, што прэзэнтацыя пройдзе ў форме дня народзінаў Карлсана. Ня толькі Карлсан будзе забаўляць дзяцей, але і малыя будуць віншаваць яго з днём нараджэньня.

**«НН»: За гэтай кнігай будуць наступныя?**

**НМ:** Так, безумоўна. Ахвота яшчэ не прапала. Цяпер будзем рыхтаваць другую і трэцюю частку Карлсана. Ёсьць у плянах выданьне і кніг беларускіх аўтараў.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

Чалавек лістапада — старонка 10.

# Пуцін едзе выкручваць рукі?

Нечакана абвешчана, што прэзыдэнт Расеі 13—14 сьнежня наведае Менск з афіцыйным візытам — першым за доўгі час. Візыт адбудзецца за 3 дні да даты вызначэньня кандыдата ад «Адзінай Расеі» на пасаду прэзыдэнта і напярэдадні экстраардынарна раньняга паседжаньня новаабранай Дзяржаўнай Думы.

Пра двухдзённы афіцыйны візыт Уладзімера Пуціна ў Беларусь 13—14 сьнежня паведаміў журналістам дзяржаўны сакратар так званай «саюзнай дзяржавы» Павал Барадзін.

14 сьнежня ў Менску мае адбыцца чарговае паседжаньне Вышэйшае дзяржаўнае рады.

Са словаў Барадзіна, як перадаюць інфармацыйныя агенцтвы, на паседжаньні будуць абмяркоўвацца, сярод іншага, пытаньні падпісаньня канстытуцыйнага акту саюзнай дзяржавы. Гэты дакумэнт даўно фігуруе ў якасьці праекту, але дагэтуль пытаньні адкладаліся ў доўгую скрыню праз няўзгодненасьць беларускіх і расейскіх інтарэсаў.

Візыт плянуецца як двухдзённы. Гэта таксама незвычайна, як і абвяшчэньне візыту ў апошні момант. Апошнія разы, у прыватнасьці, на саміт СНД, Пуцін прылятаў у Беларусь усяго на пару гадзінаў, і кантакты з кіраўніцтвам Беларусі мелі абмежаваны характар.

Якія мэты мае Пуцін 13—14 сьнежня? Ці гэта толькі палітычны піяр напярэдадні рашэньня аб наступным прэзыдэнту? Ніхто не сумняецца, што расейцы паслухмяна прагаласуюць за кандыдата, вылучанага «Адзінай Расеяй». Ці гэта нешта большае — спроба падоўжыць палітычнае жыцьцё Пуціна праз наддзяржаўную надбудову саюзу Беларусі і Расеі, праз пасаду прэзыдэнта гэтай пустой, аднак патэнцыйна магутнай структуры? Умацаваньне такой надбудовы несла б пагрозу дзяржаўнаму сувэрэнітэту Беларусі ўжо ў сярэднетэрміновай пэрспэктыве.

Ніхто не разумеў патрэбу агульнанацыянальнай кампаніі праслаўленьня Пуціна, што разгарнулася ўвосень. Такую кампанію звыкла праводзіць кандыдат на пасаду, а тут — прэзыдэнт, які нібыта сыходзіць, каб не парушаць канстытуцыі.

Візыт адбудзецца за 3 дні да даты вызначэньня кандыдата ад «Адзінай Расеі» на пасаду прэзыдэнта (17 сьнежня) і напярэдадні экстраардынарна раньняга паседжаньня новаабранай Дзяржаўнай Думы.

Ніхто, дарэчы, не разумее таксама, чаму прэзыдэнт Пуцін запатрабаваў тэрміновага скліканьня Дзяржаўнай Думы, абранай 3 сьнежня. Між тым Дума здольная апэратыўна ратыфікаваць нейкія пагадненьні, якія мяркуецца падпісаць у Менску.

Вэрсію аб тым, што 13—14 сьнежня Беларусь чакаюць ціск і выкручваньне рук з боку Расеі, варта разглядаць усур'ёз.

**Мікола Бугай**



**У.Пуцін падчас восеньскай «кампаніі праслаўленьня».**

# Мы больш падрыхтаваныя для ўступленьня ў ЭС, чым Польшча ці Балтыя

заявіў **Лукашэнка** ў інтэрвію газэце «Эль Паіс» і паабяцаў абдумаць умовы Эўрасаюзу.

«Краіны ЭС могуць ставіць жыцьцёва важныя для іх праблемы, ня ўмешваючыся ў нашыя ўнутраныя справы, прынамсі, на гэтым этапе. Вельмі важна, каб ЭС ня ўзводзіў жалезнай заслоны вакол Беларусі і каб мы разьвівалі дыялёг», — сказаў А.Лукашэнка.

Разам з гэтымі двухсэнсоўнымі авансамі ён паўтарыў шэраг ранейшых антыэўрапейскіх тэзісаў і выпадаў супраць апазыцыі:

«Эўропа сёньня ня хоча нармалізацыі дачыненьняў зь Беларусьсю. Таму што вельмі ў свой час далёка зайшла, а сёньня трэба, захаваўшы твар, з гэтага выйсьці. Хопіць рашучасьці ў Эўрапейскага саюзу гэта зрабіць — мы будзем сядзець за адным сталом, весьці дыялёг, калі мы хочам быць бліжэйшымі. Мы гэтага хочам і паўсюль аб гэтым гаворым. А Эўрапейскі саюз ня хоча, і ён выстаўляе нам непрымальныя ўмовы. Навошта ўмовамі абазначаць наш дыялёг? Ня трэба», — падкрэсьліў А.Лукашэнка.

На ягоную думку, Беларусь шмат зрабіла крокаў насустрач ЭС, якія былі праігнараваныя. Ён таксама паспрабаваў убіць клін між Нямеччынай і іншымі краінамі ЭС.

«Мы іх абдумаем, але я ня ўпэўнены, што калі прымем гэтыя ўмовы, эўрапейцы адгукнуцца. У эўрапейцаў няма сур'ёзнага падыходу да Беларусі, за выключэньнем, магчыма, Нямеччыны, у якой больш прагматычная пазіцыя і якая спрабуе зразумець сытуацыю. Палітыка немцаў умераная і выходзіць з рэальнай сытуацыі. У любой дэмакратычнай дзяржаве павінна быць апазыцыя, але немцы бачаць заганы тутэйшай апазыцыі і пытаюцца ў сябе, ці карэктныя яны ў дачыненьні да нас. Я не магу сказаць гэтага ў дачыненьні да іншых. Нам застаецца толькі чакаць і назіраць. Мы больш падрыхтаваныя, чым Польшча або краіны Балтыі, для ўступленьня ў ЭС», — двухсэнсоўна скончыў А.Лукашэнка.

**Буг**

# Візыт Лукашэнкі ў Вэнэсуэлу зрываецца?

У аўторак дарадцы Аляксандра Лукашэнкі на чале з Уладзімерам Макеем і Віктарам Шэйманам, што апякуецца вэнэсуэльскім праектам, спрабавалі прадказаць ход падзеяў за акіянам.






**Дарафеева сьпяе для Чавэса**

**Неўзабаве ў Каракасе адкрыецца Нацыянальная выстава Беларусі. На яе за акіян паляціць дэлегацыя ў складзе каля 300 чалавек: урадоўцы, прамыслоўцы, дзяржаўныя журналісты. А таксама любімая сьпявачка прэзыдэнта Ірына Дарафеева з сваім тэатрам.**

Пытаньні, зьвязаныя з візытам Аляксандра Лукашэнкі ў Вэнэсуэлу, што мае адбыцца, абмяркоўваліся ў аўторак на нарадзе ў Адміністрацыі прэзыдэнта. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе А. Лукашэнкі. Кіраўнік Беларусі меў ляцець за акіян у сьнежні, каб папрысутнічаць на здабычы першай тоны нафты з радовішча, якое Чавэс аддаў ва ўтрыманьне свайму адзінаму, апрача Расеі, эўрапейскаму сябру.

Параза Чавэса на нядзельным рэфэрэндуме ставіць гэтыя праекты пад сумнеў.

Шырокая грамадзкая кааліцыя — касьцёл, апазыцыйныя партыі, бізнэс, студэнцтва — здолела дабіцца немагчымага, праваліць чавэсаўскі плян канстытуцыйных зьменаў. Ён прадугледжваў пераход краіны да сацыялізму, а заадно — магчымасьць пажыцьцёвага кіраваньня прэзыдэнта-папуліста. Паводле афіцыйных зьвестак Цэнтравыбаркаму, супраць прагаласавалі 50,8 % выбарцаў. Рэальная лічба можа быць і яшчэ большай, чым абвешчаная ведамствам вэнэсуэльскай спн. Ярмошынай. Гэта пры тым, што Чавэс цалкам кантраляваў тэлебачаньне і праводзіў агітацыю з дапамогай апарату выканаўчай улады.

Правал Чавэса можа мецьтыя самыя наступствы, што і параза Пінача та на такім жа нібыта заведама пэўным рэфэрэндуме 1988 году.

Пры Чавэсу гаспадарка Вэнэсуэлы дайшла да дурнога стану, калі ў пэрыяд завоблачных цэнаў на нафту, галоўную крыніцу багацьця і адзіны артыкул экспарту, эканамічны рост апусьціўся да сьціплых парупрацэнтавых паказчыкаў, а ў краіне пачаўся дэфіцыт асноўных прадуктаў, напрыклад, малака.

Эксцэнтрычны Чавэс у эканамічных пытаньнях кіруецца палітычнымі мэтамі: ён фінансуе рэжым Кастра на Кубе, выганяе адных інвэстараў і запрашае іншых. Яму заманулася замяніць заходнія тэхналёгіі братнімі кітайскімі і беларускімі. Нядаўна ён разарваў дыпляматычныя адносіны з суседняй Калюмбіяй і давёў да канфлікту з традыцыйна блізкай Гішпаніяй. Рэпліка караля гішпанцаў Хуана Карласа II да Чавэса «А можа, ты заткнесься» ў часе лацінаамэрыканскага саміту стала, мусіць, адной з прычынаў сэнсацыйнае паразы Чавэса ў нядзелю. Паразы, якая можа зьмяніць сьвет.

З правалу Чавэса можа пачацца восень «новых папулістаў». Палітычныя пазыцыі прэзыдэнта Ахмадзінэджада ў Іране пахіснуліся, а Мугабэ ў Зымбабвэ дажывае свае апошнія дні сярод інфляцыі, што сягае 15 000 працэнтаў.

Натхнёная перамогай вэнэсуэльская апазыцыя, напэўна, паспрабуе разьвіць посьпех. Можна чакаць у найбліжэйшыя тыдні магутных маніфэстацыяў. Перад рэфэрэндумам на вуліцы ўжо выходзілі дзясяткі тысячаў студэнтаў.

Як калісьці Пінача т, Чавэс сутыкнуўся з згуртаваным непрыманьнем грамадзянскай супольнасьці. Бізнэс-колы жахае ягоная непрадказальнасьць, прафсаюзы змагаюцца за вяртаньне дабрабыту, падарванага гіганцкімі праектамі «балівaрыянізму», моладзь мае досыць цемрашальства і «дзяржаўнае ідэалёгіі», Касьцёл бачыць у дзеяньнях Чавэса эгаістычную прагу ўлады і славы.

Сваё слова можа сказаць войска, зь якога Чавэс выводзіцца, але якое ўжо аднойчы супраць яго паўставала.

У выпадку падзеньня Чавэса Беларусі няма чаго разьлічваць на дармовую здабычу нафты.

У аўторак дарадцы Аляксандра Лукашэнкі на чале з Уладзімерам Макеем і Віктарам Шэйманам, што апякуецца вэнэсуэльскім праектам, спрабавалі прадказаць ход падзеяў за акіянам. Сама Беларусь паўплываць на ходу падзеяў у Каракасе ня здольная. Ці захоча і ці зможа Масква прыйсьці Чавэсу на дапамогу, падтрымаць інфармацыйна і вайскова? І ці сыграе такая дапамога нейкую ролю? Зрабіць Вэнэсуэлу Кубай нумар два Расея ня мае рэсурсаў дый інтарэсу. Для падтрыманьня высокіх цэнаў на энэргарэсурсы Расея мае іншыя, больш танныя і эфэктыўныя спосабы.

Беларуская дыпляматыя недастаткова дасьведчаная, каб рабіць такія прагнозы. Але сама канструкцыя з апорай на заакіянскі папулісцкі рэжым занадта хісткая, каб пратрымацца доўга.

**Мікола Бугай**





А «N.R.M.», пакуль тое, іграе ў «Графіці».

# Музыкі вяртаюцца на афіцыйную сцэну

Навіны апошніх дзён: аўтограф–сэсія **Neuro Dubel** у самай буйной дыскарні Менску, вялікія канцэрты **«Крамбамбулі»** і праекту **«Народны альбом»**.

Як стала вядома ТГ — гэта далёка ня ўсё: Зьмітра Вайцюшкевіча запрасілі да ўдзелу ў навагоднім праекце тэлеканалу АНТ, гурт «Палац» трапіў у лік 15-ці прэтэндэнтаў на адборачны тур да «Эўравізіі-2008», а разам з тым Neuro Dubel з «Палацам» рыхтуюцца да вялікага канцэрту ў сакавіку, які пройдзе ў Палацы Рэспублікі.

Навіна з прэтэнзіяй на сэнсацыю, гэта тое, што гурт «Палац» трапіў у 15 прэтэндэнтаў на адборачны тур да «Эўравізіі-2008». Усяго на конкурс было пададзена 60 заяваў. 27 лістапада ўсе тэрміны выйшлі і журы на чале з Аляксандрам Ціхановічам адабрала 15 самых годных песень, якія адпавядаюць усім патрабаваньням. «Палац» адмыслова для «Эўравізіі» падрыхтаваў песьню «Кола грукатала». У гэтую пятніцу мае адбыцца арганізацыйная сустрэча, на якой будуць абмеркаваныя ўсе акалічнасьці адборачнага канцэрту, які заплянаваны на студзень 2008 году. Арганізатарам адборачнага туру — нацыянальнага тэлевізыйнага музычнага праекту «Эўрафэст» — зьяўляецца Дзяржтэлерадыёкампанія Беларусі.

Тым часам яшчэ аднаго паўапальнага беларускамоўнага выканаўцу — Зьмітра Вайцюшкевіча — запрасілі да ўдзелу ў навагоднім тэлепраекце тэлеканалу АНТ. «Мне прапанавалі выканаць песьню «Бывайце здаровы» і яшчэ адну. Я пагадзіўся папярэдне. Чакаю, што будзе далей», — паведаміў ТГ сьпявак.

І яшчэ адна навіна — у сакавіку ў Палацы Рэспублікі плянуецца вялікі канцэрт з удзелам гуртоў Neuro Dubel і «Палац». Апошні раз Аляксандар Кульлінковіч і Алег Хаменка выступалі на адной з самых буйных канцэртных пляцовак сталіцы роўна тры гады таму — 12 сьнежня 2004 году ў межах сьвяткаваньня гадавіны «Тузіна Гітоў». Плянуецца, што сакавіцкі канцэрт будзе дабрачынны, мэта яго — аказаць дапамогу дзецям-інвалідам. «Я б ня зьвязваў гэтае запрашэньне з нашым візытам у Адміністрацыю прэзыдэнта», — сказаў ТГ лідэр «Палацу» Алег Хаменка.

**Сяргей Будкін, Тузін Гітоў**

# Танны газ бывае толькі ў Беларусі

Час падарункаў скончыўся: за адносна танны газ у першым квартале 2008 г. давядзецца разьлічвацца маёмасьцю ды эканамічнымі саступкамі.

Віцэ-прэм’ер Беларусі Ўладзімер Сямашка заявіў, што ў першым квартале 2008 г. беларусы будуць атрымліваць газ па цане $119,5 за тысячу кубамэтраў. Газэта «Белорусы и рынок» называе гэтую досыць аптымістычную заяву найбольш прывабным для афіцыйнага Менску варыянтам у гандлі з Расеяй. Тым больш, што перамовы яшчэ працягваюцца, і пакуль рана казаць пра канчатковыя лічбы.

У гэтай сувязі варта ўзгадаць нядаўнія заявы «Газпрому» пра прывязку цаны газу для Беларусі да цаны паліва для Польшчы.

У любым разе, мяркуе «БР», час таннага паліва мінуў, і ня варта чакаць з боку Масквы прыемных сюрпрызаў — за саступкі ў цане, нават нязначныя, давядзецца разьлічвацца маёмасьцю ды эканамічнымі саступкамі.

«Газпром» выказвае цікавасьць да шэрагу беларускіх прадпрыемстваў нафтахіміі, а таксама ня супраць палепшыць на сваю карысьць тарыфную палітыку.

Расейскі манапаліст перажывае досыць напружаны момант, што ёсьць ці не асноўнай прычынай, зь якой ня варта больш чакаць ад яго бясплатных саступак у цане. Азіяцкі рынак усё больш настойліва патрабуе падвышэньня цаны свайго паліва — усьлед за Туркмэністанам, пра магчымае падаражаньне газу заявіў Узбэкістан. Сёлета «Газпром» ужо набываў узбэцкі газ па новай цане — за $100 за тыс. куб.м. супраць старога кошту ў $60. Усьлед за Ўзбэкістанам і Туркмэністанам узьняць кошты можа і Казахстан.

Расея, зважаючы на скарачэньне ўласнай здабычы газу, толькі павялічвае пастаўкі газу з гэтага рэгіёну. Падаражаньне туркмэнскага газу адаб’ецца на цане газу для Ўкраіны, а наступствы ініцыятывы іншых сярэднеазіяцкіх удзельнікаў газавага рынку, улічваючы кантроль «Газпрому» над асноўнымі шляхамі газавага транзыту, адчуюць ня толькі Беларусь і Ўкраіна, але й некаторыя краіны ЭС.

**Сямён Печанко**

## СЬЦІСЛА

### Беларусь гатовая прадаць і МТС

Прадаўшы «Вэлком», Беларусь гатовая абмеркаваць і пытаньне аб павелічэньні пакету МТС у аднайменным расейска-беларускім СП да кантрольнага зь сёньняшніх 49%, што дазволіць расейскай кампаніі кансалідаваць вынікі, сказаў журналістам намесьнік міністра сувязі Іван Рак. «Ёсьць даручэньне вывучыць гэтае пытаньне. Яно знаходзіцца ў стадыі разгляду. Неабходна даваць ацэнку, калі гэтае пытаньне будзе рашацца», — сказаў Іван Рак. Ён адмовіўся назваць велічыню меркаванага пакету і сказаць нешта пра тэрміны і магчымы кошт.

### БПБ-Банк узнагародзілі

Банкам году ў Беларусі названы ААТ БПБ-Банк (былы «Белпрамбудбанк»). Узнагарода заснаваная аўтарытэтным эканамічным часопісам «The Banker» (Вялікабрытанія). «The Banker» штогод ладзіць конкурс «Банк году». Гэта адна з найбольш прэстыжных узнагародаў у банкаўскіх колах. Крытэрыі перамогі — добрыя фінансавыя паказчыкі банка, якія разглядаюцца ў дынаміцы, распрацоўка і ўкараненьне сучасных тэхналёгіяў, пастаноўка і рэалізацыя стратэгічных задачаў. У Расеі у 2007 г. перамог Ашчадны банк, у Польшчы — PKO Bank Polski, Украіне — Райфайзэн Банк Аваль, Вялікабрытаніі — Royal Bank of Scotland, Нямеччыне — Deutsche Bank, Францыі — BNP Paribas, Італіі — Unicredit, Нідэрляндах — ING Bank.

### Малаказаводы нясуць страты

Айчынныя малаказаводы нясуць страты праз апярэджаньне росту закупных цэнаў адносна цэнаў на гатовую прадукцыю. Найбольш складаная сытуацыя склалася на прадпрыемствах, у структуры перапрацоўкі якіх пераважае цэльнамалочная прадукцыя. Не найлепшы час перажываюць таксама арыентаваныя на экспарт прадпрыемствы. За апошні год закупныя цэны на малако ўзрасталі чатыры разы, у суме гэты рост склаў 25%. Цэны на сацыяльна значныя малочныя прадукты ў залежнасьці ад іх тлустасьці вырасьлі толькі на 6—14,8%.

### Наступствы санкцыяў супраць «Белнафтахіму»

Каб апярэдзіць нэгатыўныя наступствы санкцыяў з боку ЗША, беларускі бок прапануе разьлічвацца за расейскія энэргарэсурсы расейскімі рублямі. Пра гэта паведаміў міністар фінансаў Мікалай Корбут. Словы беларускага міністра знайшлі падтрымку з боку намесьніка старшыні праўленьня «Газпрому» Аляксандра Мядзьведзева, які паведаміў журналістам пра магчымы пераход разьліку за энэрганосьбіты на расейскія рублі ды эўра. Аднак на прадпрыемствах «Белнафтахіму» такая ідэя прыйшлася не да спадобы. Праз адмоўнае сальда ў $1,5 млрд ды падаражаньне цягам году расейскага рубля адносна беларускай валюты на 9%, пераход на разьлік за энэргарэсурсы ў расейскай валюце пацягне за сабой істотныя дадатковыя выдаткі.

**СП; БЕЛТА, «Белорусы и рынок», «Экономическая газета»**

# Расея абірае «калектыўнага Пуціна»

На выбарах у Думу элегантна перамог «калектыўны Пуцін». Піша **Аляксандар Класкоўскі**.

Якой бы ні стала канфігурацыя ўлады ў Расеі пасьля гэтых дзьвюх кампаніяў — сёньняшніх выбараў у Думу ды прэзыдэнцкіх у сакавіку 2008-га, відавочна, што групоўка цяперашняга гаспадара Крамлю ня выпусьціць лейцаў з рук.

Таму варта чакаць, што ў дачыненьні да Беларусі будзе весьціся той самы курс. Будуць ціснуць эканамічна і дамагацца палітычных саступак. Даволі востра стаіць праблема экспансіі расейскага капіталу. Пра намер іх таўстасумаў скупіць «гэты кавалак зямлі» не аднойчы казаў апошнім часам і Аляксандар Лукашэнка.

Але ці ёсьць у беларускай улады рэсурсы супрацьстаяньня? Пакуль мы бачым хіба што спробы захаваць умоўны балянс пры распродажы пакетаў акцыяў. Нешта трапляе расейцам, але разам з тым, «Вэлком», напрыклад, прадалі ўсё ж у выніку аўстрыйскай кампаніі.

Перад думскімі выбарамі Крэмль нечувана ўзьняў градус антызаходняй рыторыкі. На гэтым тле афіцыйны Менск зь яго хай сабе і своеасаблівымі развагамі пра дыялёг здаецца ледзь ці ня ўзорам палітычнае культуры. Ва ўсякім разе, Пуцінава пэрліна: маўляў, хай заходнікі ня сунуць «саплівы нос» у расейскую палітыку — па-за канкурэнцыяй.

Палітолягі разважаюць: пакольк і расейскі рэжым усё болей падобны на беларускі, а ў нечым нават яго і перасягнуў што да закручваньня шрубаў, дык ці не падхлісьне гэта «братнюю інтэграцыю»?

Тут усё ня так адналінейна.

Цікава, што на нядаўнім сэмінары для мясцовай вэртыкалі афіцыйны кіраўнік Беларусі ўзьняў геапалітычную тэму. Маўляў, наша краіна мусіць максымальна скарыстаць выгаду ад знаходжаньня між двума моцнымі полюсамі — Расеяй ды Эўропай.

Ідэя ў прынцыпе ня новая. Так спрабавалі некалі Броз Ціта, Чаўшэску. Але для сёньняшняй Беларусі абсяг манэўру даволі вузкі.

Зразумела, што саступкі патрабаваньням Захаду пагражаюць кіроўным вярхам Беларусі паступовым распаўзаньнем сыстэмы з усімі непрыемнымі для іх наступствамі. Але ж і гульні з Расеяй усё болей небясьпечныя. Бізантыйскія норавы Крамлю не дазваляюць спадзявацца на нейкую джэнтэльмэнскую дамову, урэшце — на гарантыі. Імпэрыя можа толькі зьесьці. Эўропа, ва ўсякім разе, не імпэрыя.

Што ж да нашай дэмакратычнай грамадзкасьці, то вынікі выбараў у Расеі і ўвогуле цяперашні крамлёўскі трэнд наўрад ці яе дэмаралізуюць. Наадварот. Пры тым што імпэрская небясьпека застаецца, пакрысе мацнеюць надзеі на тое, што ў Беларусі будзе ў выніку іншы трэнд.

**Прадказальны вынік выбараў у Расеі**

«Адзіная Расея» на выбарах у Дзярждуму Расеі атрымала 64,2% галасоў выбаршчыкаў.

У Камуністычнай партыі РФ — 11,6%.

Лібэральна-дэмаратычная партыя Жырыноўскага — 8,2%.

«Справядлівая Расея» — 7,8%.

Менавіта гэтыя чатыры партыі і праходзяць у парлямэнт.

Астатнія адстаюць ад іх зь вялікім адрывам. Правальны вынік паказалі праэўрапейскія і лібэральныя сілы. «Яблоко» набрала ўсяго 1,6, а Саюз правых сілаў — 1%. Найбольш працэнт галасоў яны сабралі ў Пецярбургу і Калінінградзе (там за іх галасавала да 10% выбарцаў).




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Кандаліза Райз сустрэлася зь беларускай дэлегацыяй


AP

У часе сустрэчы дзяржсакратарка ЗША заявіла, што Вашынгтон падтрымлівае дэмакратычны рух у Беларусі. Аляксандар Мілінкевіч, Анатоль Лябедзька, Павал Севярынец, Сяргей Калякін, Анатоль Ляўковіч, Зьміцер Хведарук і Эніра Браніцкая наведваюць ЗША на запрашэньне Хэльсынскай камісіі Кангрэсу ЗША.

Яны распаўсюдзілі адкрыты зварот да беларускага ўраду. Яны гатовыя прасіць урад ЗША «спрыяць інвэстыцыям у беларускую эканоміку, разгледзець пытаньне прадстаўленьня крэдыту, скасаваць санкцыі супраць чыноўнікаў». Узамен апазыцыя патрабуе «вызваленьня палітвязьняў, спыненьня рэпрэсіяў супраць дэмакратычных актывістаў, стварэньня роўных умоваў дзейнасьці для СМІ, спыненьня практыкі нерэгістрацыі грамадзкіх арганізацыяў, унясеньня зьменаў у выбарчае заканадаўства».

**Буг; Радыё «Свабода»**

## У Горадні будуць беларускамоўныя групы

Аддзел адукацыі Гарадзенскага гарвыканкаму ідзе насустрач Бацькоўскаму камітэту па арганізацыі беларускамоўных групаў у дзіцячых садках. Як паведамляе Ігар Кузьмініч з Бацькоўскага камітэту, ужо ды схіляюцца дазволіць стварэньне рознаўзроставай беларускамоўнай групы з 13 дзетак. Столькі сем'яў падпісалі адпаведнае прашэньне.

**Буг; Эўрарадыё**

## Восем гадоў ідэолягу з Адміністрацыі



Вярхоўны суд прыгаварыў Уладзімера Холада да 8 гадоў пазбаўленьня волі ў выпраўленча-працоўнай калёніі ўзмоцненага рэжыму. Пра гэта паведаміла журналістам прэс-сакратарка суду Настасься Цімановіч. Суд быў закрытым. Былога чыноўніка Адміністрацыі прэзыдэнта абвінавацілі ў падбухторваньні да дачы хабару ў буйным памеры і махлярстве.

**Буг**

## Толькі два з нападнікаў на Ломаця трапяць у турму

Вярхоўны суд вынес прысуд у справе аб зьбіцьці старшыні Камітэту дзяржаўнага кантролю Зянона Ломаця. Судовы працэс пачаўся 5 лістапада і праходзіў пры зачыненых дзьвярах. У выніку Сяргей Наркевіч атрымаў 5 гадоў калёніі ўзмоцненага рэжыму, Аляксандар Арлоўскі — два гады, Юры Загорскі і Сяргей Манаеў — толькі абмежаваньні па службе. Ім інкрымінавалася парушэньне арт. 445 КК «Перавышэньне ўлады і службовых паўнамоцтваў з прымяненьнем сілы».

**ЗП**


PHOTO.BYMEDIA.NET

## Трансьляцыя «Белсату» пачнецца 1 студзеня

Пробная трохгадзінная трансьляцыя тэлеканалу «Белсат» заплянаваная на 10 сьнежня, а сталая трансьляцыя (16 гадзінаў за дзень) пачнецца з 1 студзеня. Перадачы робяцца і запісваюцца ў Варшаве, Беластоку, Вільні і Менску. Ужо гатовыя першыя ток-шоў з удзелам беларускіх грамадзкіх і культурных дзеячоў, у тым ліку Уладзімера Арлова, Андрэя Хадановіча, Уладзімера Парфяновіча. Гэтымі днямі ідуць здымкі каляднага канцэрту з удзелам Касі Камоцкай, «Тав. Маўзэра» і рокераў.

**Буг**

## Чаргінцоў суд



У сераду ў судзе Першамайскага раёну Менску адбылася папярэдняе судовае разьбіральніцтва паводле пазову кіраўніка афіцыйнага пісьменьніцкага саюзу Мікалая Чаргінца да журналіста Аляксандра Тамковіча і прыватнага прадпрыемства «Час навінаў». Нагодай стаў артыкул А.Тамковіча «Генэрал-сэнатар Мікалай Чаргінец» у недзяржаўнай газэце «Новы час», якую выдае «Час навінаў». На думку М. Чаргінца, надрукаваны ў верасьні артыкул нанёс шкоду ягонаму гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі. Гэтую шкоду ён ацаніў у 600 мільёнаў рублёў, якія праз суд зьбіраецца спагнаць з журналіста (100 мільёнаў) і выдавецтва.

Бакі не прыйшлі да міравога пагадненьня. Прэтэнзіі Чаргінца да журналіста і газэты засталіся ранейшымі, як і памер грашовай сплаты, якую ён хоча атрымаць за абразу гонару і годнасьці. Судзьдзя Алена Ананіч прызначыла дату першага судовага паседжаньня на 19 сьнежня. Суд распачнецца ў 10 гадзінаў па адрасе Талбухіна, 9.

**Сямён Печанко**

# Грушаўскія хаты сталі Мэтрабуду ўпоперак горла

Нявырашаныя праблемы з зносам хатаў ставяць пад пытаньне тэрміны рэканструкцыі праспэкту Дзяржынскага ў Менску. Новая станцыя «Грушаўка» будзе пабудаваная акурат пад праспэктам на скрыжаваньні з вуліцай Шчорса. Яшчэ ў верасьні плянавалася перакрыць гэты невялікі ўчастак, а зьлева і справа ад яго пусьціць аб'язныя рукавы для машынаў. Ды вось загваздка: некалькі драўляных хатаў сталі ўпоперак горла Мэтрабуду. «Багата якіх жыхыроў не задавальняюць варыянты перасяленьня, вось яны і не даюць згоды на знос, — тлумачыць Міхаіл Рызер, начальнік тэхнічнага аддзелу УП «Дырэкцыя па будаўніцтве Менскага мэтрапалітэну». — Напрыклад, на будучай «Грушаўцы» дзеля трох хатаў мы ня можам пачаць актыўныя будаўнічыя працы. Аналягічная праблема на «Міхалове».

**АК; «Рэспубліка»**

## Былы памежнік Паўлоўскі паедзе паслом у Францыю



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Паводле нашай інфармацыі, былы старшыня Дзяржаўнага камітэту пагранічных войскаў Аляксандар Паўлоўскі адправіцца працаваць паслом у Францыю. Ён ужо атрымаў агрэман. 57-гадовы Паўлоўскі быў звольнены з пасады ў красавіку.

**Зьміцер Панкавец**

## Справу Фінькевіча перадалі ў суд

Новую крымінальную справу супраць палітвязьня Артура Фінькевіча яшчэ ў сераду 28 лістапада перадалі з пракуратуры ў суд Кастрычніцкага раёну Магілёва. Пра гэта паведаміла маці Фінькевіча спн.Марыя. Дата пачатку судовага працэсу пакуль не прызначаная. Невядома, ці будзе гэты працэс адкрытым.

**ЗП**

## Вярхоўны суд рыхтуецца да адмены сьмяротнага пакараньня

Беларусь ужо падыйшла да рубяжу, за якім стаіць мараторый на ўжываньне сьмяротнага пакараньня, заявіў старшыня Вярхоўнага суду Валянцін Сукала **(на фота)**. Ужо сем гадоў у Беларусі дзейнічае альтэрнатыва сьмяротнаму пакараньню — пажыцьцёвае зьняволеньне, «таму выключная мера пакараньня ўжываецца вельмі рэдка». «У Канстытуцыі сказана, што сьмяротнае пакараньне — часовая мера, якая рана або позна будзе адмененая, — дадаў ён. — Так, нялёгка знаходзіць адэкватнае пакараньне, калі гаворка ідзе аб сэрыйных забойцах або справах буйных бандаў. Напрыклад, бандай Марозава было зьдзейсьнена больш за 20 забойстваў. Аднак мы псыхалягічна рыхтуем судзьдзяў да таго, што сьмяротнае пакараньне будзе адменена», — заявіў В.Сукала.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Буг; «СБ — Беларусь сегодня»**

### У Вясьнянцы зьявіцца штаб-кватэра Алімпійскага камітэту і гатэль «Radisson»

Штаб-кватэра разьмесьціцца ў Менску на скрыжаваньні праспэкту Пераможцаў і вуліцы Радужная. Аб'ект будзе будавацца за кошт замежнага інвэстара. Побач будзе збудаваны пяцізоркавы гатэль «Radisson».

## Зьявіліся бел-чырвона-белыя флікеры

Ініцыятар акцыі, намесьнік старшыні «Руху «За Свабоду» Юрась Губарэвіч, перакананы, што флікеры паспрыяюць бясьпецы на дарогах. Флікеры будуць распаўсюджвацца бясплатна. «Наш нацыянальны сьцяг мусіць асьвятляць дарогу і ў цемры», — кажа Губарэвіч.

Флікер выраблены ў выглядзе бірулькі, на адным баку якой выява нацыянальнага сьцягу, а на другім — знак «Руху «За Свабоду». Яго можна мацаваць на заплечніку ці вопратцы. З часам Губарэвіч хоча вырабіць і бел-чырвона-белую нарукаўную стужку.



## Ірыну Кужэльную шукаюць на дачах

Зьніклую 23 лістапада 7-гадовую дзяўчынку Іру Кужэльную на Лагойшчыне шукае ўсё больш людзей, ужо некалькі соцень чалавек. Прачэсваюць лясы, а цяпер і дачы. Маці дзяўчынкі затрымалі. Пачалі супраць яе крымінальную справу: падазраюць, што яна катавала дачку.

## Птушыны грып вакол нас

У Польшчы выяўлены асяродкі хваробы. Зачапіла дзьве фэрмы побач з Плоцкам (каля 280 км ад беларускай мяжы). Заражаную тэрыторыю кантралююць вэтэрынары і паліцыя. На думку санітарных службаў, у гандлёвую сетку магло трапіць мяса каля 2 тыс. інфікаваных індыкоў. Фэрмы ачапіла паліцыя. Беларусь застаецца адной зь нямногіх у Эўропе, дзе пакуль не зафіксавана ніводнага выпадку небясьпечнай хваробы.

**Буг**

## Пост ідзе

У праваслаўных пост пачаўся 28 лістапада і будзе доўжыцца да 6 студзеня. У каталікоў з 2 сьнежня пачаўся адвэнт — літургічны пэрыяд падрыхтоўкі да Божага Нараджэньня, пэрыяд радаснага чаканьня прыходу на сьвет Хрыста Збаўцы.



# Чалавек лістапада

Хто варты званьня асобы апошняга восеньскага месяца? Чые справы былі найважнейшымі, хто найбольш заслужыўся для беларускай супольнасьці? Запрашаем чытачоў да галасаваньня.

**Выдаўцы «Карлсана».** Група энтузіястаў выдала па-беларуску адзін з самых вядомых твораў швэдзкай пісьменьніцы Астрыд Ліндгрэн «Малы і Карлсан-з-даху». Пераклаў казку Юрась Жалезка, рэдактарам кнігі выступіў Лявон Баршчэўскі. Праектам апекаваліся Настасься Мацяш і Алесь Яўдаха. Выдаўцы спрабуюць запоўніць пустку зь беларускамоўнай дзіцячай літаратурай, якая ўтварылася праз лукашэнкаўскае кіраваньне. Цяпер да друку рыхтуецца яшчэ адна казка Ліндгрэн пра «Піпі Доўгуюпанчоху».

**Кульлінковіч і рок-музыкі.** Лістапад для музыкаў пачаўся забаронай клюбнай прэзэнтацыі новага альбому «Нэйра Дзюбэля» «Штазі». Лідэр гурту Аляксандар Кульлінковіч пракамэнтаваў гэтую сытуацыю проста: «Выцерлі ногі». Аднак 21 лістапада адбылася сустрэча музыкаў Лявона Вольскага, Аляксандра Кульлінковіча, Піта Паўлава, Ігара Варашкевіча і Алега Хаменкі з галоўным ідэолягам краіны Алегам Праляскоўскім. Чыноўнік паабяцаў рокерам зьняць зь іх забарону, калі музыкі адмовяцца выступаць на мітынгах апазыцыі. Паход музыкаў у Адміністрацыю прэзыдэнта выклікаў неадназначную рэакцыю сярод удзельнікаў інтэрнэт-форумаў і блогаў: адны хваляць іх за сюрпрыз, за неардынарную спробу зьняць забарону зь беларускай культуры, другія ганяць за канфармізм.

**Аляксандар Глеб.** Зборная Беларусі па футболе правяла надзвычай удала лістападаўскі адрэзак. Спачатку ў Тыране нашы хлопцы перайгралі альбанцаў (4:2), пасьля ў Менску перамаглі моцных галяндцаў. Гэта дазволіла зборнай падняцца ў рэйтынгу ФІФА на амаль рэкорднае 60-е месца. З прыходам Бэрнда Штанге на трэнэрскі мосьцік, Глеб пачаў гуляць за зборную з зусім іншым імпэтам. Плюс да ўсяго ён стаў капітанам каманды. Пры канцы месяца паўабаронца лёнданскага «Арсэналу» быў пяты раз прызнаны найлепшым футбалістам Беларусі.

**Кацярына Салаўёва.** 19-гадовай полацкай дзяўчыне пагражаюць адразу трыма крымінальнымі справамі — за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі, абразу чырвона-зялёнага сьцяга і нанясеньне палітычных графіці. Толькі за апошні месяц у Полацку невядомыя двойчы вывешвалі над гарвыканкам бел-чырвона-белы сьцяг. КДБ ужо некалі разоў праводзіў допыты дзяўчыны, таксама адбыўсяператрус у інтэрнаце, дзе Кацярына жыве. Пры канцы месяца кіраўніцтва Полацкага дзяржаўнага ўнівэрсытэту на паседжаньні адмысловай дысцыплінарнай камісіі прыняло рашэньне аб немэтазгоднасьці далейшага навучаньня Кацярыны Салаўёвай.

**Аляксандар Радзькоў.** Міністар адукацыі быў адзінагалосна абраны старшынём рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня «Белая Русь». Многія лічаць, што менавіта на базе «Белай Русі» можа быць створаная беларуская партыя ўлады. У адным зь першых інтэрвію пасьля абраньня Радзькоў заявіў: «Мы маем намер супрацоўнічаць з усімі зацікаўленымі асобамі, у тым ліку і з апазыцыйнымі. Нам цікавая гэтая дыскусія, сутыкненьне меркаваньняў. Мы гатовыя да размовы і дыялёгу з усімі і з кожным».

**J-морс.** Папулярны музычны гурт выпусьціў першы беларускамоўны альбом «Адлегласьць». На дыск увайшло 11 песень, сярод якіх — тры песьні з папярэдніх альбомаў, два пераклады кампазыцый з расейскай мовы і шэсьць новых запісаў. Лідэр гурту Ўладзімер Пугач так матываваў выданьне беларускамоўнага дыску: «Даказаць сабе і іншым, што беларускамоўная музыка таксама можа быць папулярнай і павінна гучаць на радыё».

**Уладзімер Савіч.** Кіраваць Саюзам мастакоў у наступныя тры гады будзе прафэсар і незалежная асоба. Уладзімер Савіч на апошнім зьезьдзе Саюзу перамог свайго канкурэнта скульптара Аляксандра Дранца ўсяго на два галасы.

**Натальля Ільініч.** Пухавіцкі раённы суд асудзіў настаўніцу зь вёскі Талька да 1,5 гадоў папраўчых працаў. Яе абвінавацілі ў падбухторваньні да падробкі мэдыцынскай даведкі. Даведка была прызначаная для дачкі спн. Натальлі, Дар'і, якая сёлета вясной езьдзіла ў Польшчу, каб паўдзельнічаць у гістарычным сэмінары. Дар'ю спрабаваў завэрбаваць супрацоўнік КДБ, палохаючы, што дасьць хаду справе з даведкамі. Дзяўчына адмовілася ад супрацоўніцтва. Натальля Ільініч увесь час рашуча была на баку дачкі, і нават суд яе не зламаў.

**Гары Каспараў.** Дэмакратыя ў Расеі перажывае цяжкія часы. Прастора свабоды скурчылася, асноўныя правы чалавека абмежаваныя нават мацней, чым у Беларусі. Шавіністычны псыхоз мацнее зь месяца ў месяц. У Маскве прайшоў чарговы «Марш нязгодных». На акцыю выйшла каля чатырох тысячаў сьмелых людзей. АМОН ужыў сілу супраць дэманстрантаў, было шмат затрыманых. Да пяці сутак арышту быў асуджаны экс-чэмпіён сьвету па шахматах Гары Каспараў, які спрабуе згуртаваць розныя палітычныя сілы, інтэлектуалаў і грамадзянскую супольнасьць на абарону свабоды і плюралізму. Дзейнасьць людзей кшталту Каспарава пакідае Расеі надзею на эўрапейскую будучыню.

**Зьміцер Панкавец**

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

### Хто, па-Вашаму, можа лічыцца чалавекам лістапада?

| | |
|---|---|
| Выдаўцы «Карлсана» | 162 (28.4 %) |
| Кульлінковіч і рок-музыкі | 85 (14.9 %) |
| Аляксандар Глеб | 31 (5.4 %) |
| Кацярына Салаўёва | 145 (25.4 %) |
| Аляксандар Радзькоў | 10 (1.8 %) |
| J:морс | 35 (6.1 %) |
| Уладзімер Савіч | 5 (0.9 %) |
| Натальля Ільініч | 46 (8.0 %) |
| Гары Каспараў | 52 (9.0 %) |

Усяго прагаласавала: 571

# Ці пагражае рублю дэвальвацыя

Працяг са старонкі 1.

А яшчэ вельмі падобнае да другога страшнага слова — дэвальвацыя. Разьбірацца, якая розьніца паміж гэнымі пачварамі, не ставала часу. Не супакойвалі нават «запэўніваньні» Нацыянальнага банку, які абяцаў «прыкласьці ўсе намаганьні, каб пазьбегнуць дэвальвацыі». У выніку замест таго, каб несьці грошы ў банкі, шмат хто пайшоў зь імі ў валютныя шапікі ды набыў даляры ці эўра. А пасьля, як усё сьцішылася, такі панёс тыя даляры ў банкі. З таго часу мінуў амаль год, ды падышоў час чарговага падвышэньня цэнаў на расейскі газ. А разам зь ім і пытаньне: што рабіць з ашчаджэньнямі?

Каб адказаць на гэтае пытаньне, можна паглядзець на тое, што адбывалася на валютным рынку краіны цягам дзевяці месяцаў 2007 году. Пра праблемы канца мінулага — пачатку гэтага году мы ўжо ўзгадвалі — тады насельніцтва за два месяцы прадало валюты амаль на 350 мільёнаў даляраў меней, чым набыло. За гэтыя ж два месяцы беларускія ды замежныя прадпрыемствы таксама набылі больш валюты, чым прадалі. Агульны дэфіцыт валютнага рынку склаў больш за паўмільярда даляраў. Але ж тады Нацбанк знайшоў у сваіх рэзэрвах грошы, каб утрымаць рубель. Літаральна ў лютым хваляваньні сьцішыліся, а з сакавіка валютныя рэзэрвы краіны пачалі патроху павялічвацца. На пачатак кастрычніка яны дасягнулі нечуванай для Беларусі велічыні — 3,1 мільярда даляраў (паводле мэтадалёгіі Нацбанку).

Але ці шмат гэта для Беларусі, ці хопіць, каб утрымаць курс рубля? Ёсьць некалькі падыходаў да ацэнкі ўстойлівасьці нацыянальнай валюты. Міжнародны валютны фонд разглядае валюту як стабільную, калі валютныя рэзэрвы краіны роўныя кошту трох месяцаў імпарту тавараў і паслугаў. За апошнія дванаццаць месяцаў мы імпартавалі тавараў і паслугаў амаль на 28 мільярдаў даляраў, ці 2,3 мільярды ў сярэднім на месяц. То бок рэзэрваў Нацбанку хопіць, каб набыць імпарт амаль што за паўтара месяца, ці ў два разы меней за крытэр МВФ.

І ўсё ж, перш чым бегчы ў банк ды забіраць адтуль свае ашчаджэньні, давайце прыгадаем, ці рабілі вы гэта на год-два раней. Валютныя рэзэрвы Нацыянальнага банку ўпершыню ў гісторыі дасягнулі кошту месяца імпарту толькі ўлетку. І ў 2003, і ў 2004, і ў 2005 гадох курс беларускага рубля адносна даляра не мяняўся, прычым рэзэрвы рэдка калі былі большымі за кошт імпарту паловы месяца. Такім чынам, крытэр МВФ — цікавы паказьнік доўгатэрміновай стабільнасьці нацыянальнай валюты, але, убачыўшы яго невыкананьне, ня варта бегчы ў банк ды губляць налічаныя адсоткі.




PHOTO.BYMEDIA.NET

Але ж попыт на замежную валюту залежыць ня толькі ад велічыні імпарту. Няцяжка здагадацца, што калі Нацбанк надрукуе шмат рублёў для выплаты заробкаў ды падтрымкі айчынных вытворцаў, то даволі хутка гэтыя рублі трапяць на валютны рынак. У гэтым выпадку рэзэрвы могуць скончыцца вельмі хутка. Праўда, і на гэты раз чакальнікі крызісу расчаруюцца. У беларускім Нацбанку працуюць людзі, якія добра ведаюць, што такое «пакрыцьцё грашовай базы валютнымі рэзэрвамі». Гэтае самае пакрыцьцё цяпер перавышае 100%, то бок Нацбанк можа набыць усе рублі, якія знаходзяцца ў абарачэньні, за замежную валюту. Ізноў жа, нядаўняя беларуская гісторыя ведала часы, калі рублёў было надрукавана болей, чым мелася рэзэрваў, ды гэта ня шкодзіла валютнаму курсу.

Калі вы ўсё яшчэ вагаецеся, то аргумэнты ў бок нацыянальнай валюты яшчэ ня скончыліся. І галоўны зь іх — гэта стымулы беларускіх уладаў. Паспрабуйце паставіць сябе на іх месца. Ці былі б вы зацікаўленыя ў дэвальвацыі? Якія наступствы яна мела б для эканомікі? І, галоўнае, якія наступствы для вашае ўлады?

Самае відавочнае — дэвальвацыя пацягнула б вашых выбаршчыкаў у банкі па свае дэпазыты ў рублях. А ўжо з рублямі — на валютны рынак, дзе й бязь іх ня ўсё добра. Адсюль — яшчэ большая дэвальвацыя ды, як вынік, канчатковая страта даверу да нацыянальнай валюты. Больш за тое, калі вы абяцалі ім, што іхны заробак складзе пэўную колькасьць даляраў, то вы маеце шанец парушыць свае абяцанкі. Апошняя «прыемнасьць», якая вас чакае, гэта адказ банкаў, у якіх вы папросіце крэдытаў на падтрымку прадпрыемстваў: «Няма грошай». Бо грошы забярэ насельніцтва. Калі такое прысьніцца, то за ноч можна пасівець. Якія ўжо тут стымулы…

Аднак ёсьць жаданае, а ёсьць магчымае, якія далёка не заўжды супадаюць. Да вашага начнога жаху далучаюцца цэны на газ, нафту ды прагнае жаданьне вашага электарату купляць не беларускае, а чамусьці выключна замежнае. Вядома, Нацбанк, гэты нястомны барацьбіт з інфляцыяй, дэвальвацыяй ды іншымі навааламі, на варце. Але дзе ён бярэ валюту для папаўненьня сваіх рэзэрваў?

У параўнаньні зь лютым рэзэрвы павялічыліся на 1,3 мільярды даляраў. Палова гэтай сумы прыйшла ад продажу 12,5% акцыяў Белтрансгазу. Яшчэ частка, відаць, трапіла ў рэзэрвы пасьля продажу «Вэлкому». Астатняе — гэта грошы, пазычаныя беларускімі прадпрыемствамі і банкамі на кароткі тэрмін. Прычым пазычана было шмат больш. І гэтыя грошы мы мусім аддаць ужо на пачатку 2008 году. Вядома ж, можна пазычыць яшчэ, і без асаблівых цяжкасьцяў — нават Расея, здаецца, паабяцала паўтара мільярда крэдыту. Але чаму тады Лукашэнка ды іншыя вышэйшыя чыноўнікі так хвалююцца з прычыны падвышэньня дэфіцыту замежнага гандлю? Відаць, таму што да наступных выбараў трэба працягнуць ня год, а тры. На гэты тэрмін ва ўладаў павінная быць канцэпцыя прыцягненьня замежнай валюты. А, акрамя пазыкаў, існуе толькі адна яе крыніца — гэта замежныя інвэстыцыі. Лепей за іншых гэта разумее Нацбанк, дзякуючы намаганьням якога можна без асаблівае асьцярогі захоўваць свае рублі, даляры ці эўра ў беларускіх банках. Пакуль што можна…

**Аляксандар Чубрык**
эканаміст

# Кацярына Салаўёва і сто графіці

28 лістапада полацкай міліцыяй была затрыманая Кацярына Салаўёва. Дзяўчына прыйшла ў пракуратуру, каб скласьці скаргу адносна жорсткага затрыманьня яе два дні таму ля полацкага гарвыканкаму. Тады на будынку невядомыя зрабілі надпісы «Нас не спыніць» і «Малады фронт».

Кацярыну проста з пракуратуры завезьлі ў гарадзкі аддзел міліцыі, дзе дапытвалі па дзьвюх крымінальных справах: па артыкулах 193 «Удзел у незарэгістраванай арганізацыі» (маецца на ўвазе «Малады фронт») і 139 «Абраза нацыянальнай сымболікі» (31 кастрычніка нехта сарваў дзяржаўны сьцяг з будынку полацкай пракуратуры).

Пасьля супрацоўнікі КДБ правяліператрус у інтэрнаце, дзе пражывае К. Салаўёва. Кіраваўператрусам Сяргей Афіцэраў. Іх цікавіла ўсё, што магло б сьведчыць пра сяброўства дзяўчыны ў «МФ». У гэты час у Кацярыны адабралі мабільнік, на ўсе званкі адказваў адзін з «кадэбістаў».

У той самы дзень у міліцыі адбыўся яшчэ адзін допыт дзяўчыны. Кацярына кажа, што міліцыю таксама цікавілі больш за сто графіці, якія нядаўна зьявіліся на полацкіх сьценах. Такім чынам на Салаўёву могуць завесьці адразу тры крымінальныя справы.

У мінулую пятніцу кіраўніцтва Полацкага ўнівэрсытэту, дзе навучаецца Кацярына, на адмысловым паседжаньні прыняло рашэньне аб немэтазгоднасьці яе далейшага навучаньня ў ВНУ. Разам з тым, прынязь рашэньне аб канчатковым выключэньні дзяўчыны з ўнівэрсытэту не наважыліся, прапанаваўшы ёй самой забраць дакумэнты.



5 сьнежня дзяўчыну адлічылі з унівэрсытэту. Афіцыйная прычына — «неатэстацыя».

Кацярына Салаўёва навучалася на 2-м курсе гістарычна-філялягічнага факультэту. Вывучала ангельскую і французскую мову. Ёй 19 гадоў. Нарадзілася ў Вугоршчыне ў сям'і вайскоўцаў. Цяпер яе сям'я жыве ў Лепелі.

**Зьміцер Панкавец**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**29 лістапада**

### Пакаралі прадпрымальнікаў

Затрыманых за раздачу ўлётак з патрабаваньнем адмены ўказу № 760 прадпрымальнікаў пакаралі арыштам. Актывіст руху «За вольнае разьвіцьцё прадпрымальніцтва» **Аляксандар Таўстыка (на фота)** атрымаў 7 сутак, **Руслан Луцэнка** — 10. Судзьдзя **Алена Някрасава** прызнала прадпрымальнікаў вінаватымі ў «парушэньні правілаў арганізацыі масавых мерапрыемстваў». Суд быў закрытым, у памяшканьне пусьцілі толькі адваката затрыманых.

### Сваякі зьніклых перадалі ў пракуратуру вынікі расьсьледаваньня

Сваякі выкрадзеных у Беларусі апазыцыйных палітыкаў **Зінаіда Ганчар**, **Ірына Красоўская**, **Сьвятлана Завадзкая**, **Вольга Завадзкая**, а таксама іхныя юрыдычныя прадстаўнікі Гары Паганяйла і Алег Воўчак перадалі генэральнаму пракурору дакумэнт, угрунтаваны на выніках грамадзкага расьсьледаваньня гэтых гучных справаў. Да яго прыкладаецца хадайніцтва, каб факты, адлюстраваныя ў дакумэнтах, былі ўважліва вывучаныя і знайшлі рашэньне ў межах кампэтэнцыі генэральнай пракуратуры.

### Згадалі ахвяраў сталінізму

У Менску, у парку Чалюскінцаў і ва ўрочышчы Курапаты, адбылося традыцыйнае памінаньне ахвяраў сталінізму. Удзельнікі запалілі сьвечкі ля капліцы ў парку Чалюскінцаў і ў Курапатах — ля Крыжа пакутаў, «Лавы Клінтана», мэмарыяльнага каменя са словамі «Ахвярам сталінізму», памятных знакаў палякам і яўрэям, якія загінулі ў гады сталінскага тэрору.

### Зноў у чорных сьпісах

Міжнародная арганізацыя «Рэпартэры бязь межаў» апублікавала сьпіс з 20 краінаў, якія «праславіліся» за год ціскам на журналістаў. У гэты сьпіс увайшлі Беларусь, а таксама Туркмэністан, Узбэкістан, Віетнам, Кітай, М'янма і Паўночная Карэя, 5 афрыканскіх дзяржаваў, Сірыя, Ірак, Іран, Палестына і Куба.

Нагадаем, беларускі палітвязень **Андрэй Клімаў** быў асуджаны 1 жніўня 2007 г. да 2 гадоў турмы за артыкул у інтэрнэце і цяпер адбывае пакараньне ў Мазырскай калёніі строгага рэжыму. «Міжнародная Амністыя» прызнала А.Клімава Вязьнем сумленьня.

**3 лістапада**

### За беларускую мову да псыхіятра

Моладзевы актывіст з Гомелю **Зьміцер Жалезьнічэнка** на падставе накіраваньня прызыўной камісіі ваенкамату праходзіць псыхіятрычную экспэртызу ў абласным клінічным псыхіятрычным шпіталі. Лекарка-псыхіятар з прызыўной камісіі выпісала З. Жалезьнічэнку накіраваньне, калі ён адмовіўся запаўняць анкету прызыўніка на расейскай мове. Хлопец патлумачыў сваю адмову тым, што **ваенкам Цацарын** абяцаў яму выдаць адпаведны фармуляр на беларускай мове. Папярэдне лекарка паставіла Жалезьнічэнку дыягназ «рэакцыя апазыцыі».

### Пікет у лесе

У Віцебску забаранілі пікет, прысьвечаны Міжнароднаму дню правоў чалавека. Пра гэта паведаміў намесьнік старшыні Віцебскага гарвыканкаму **Павал Лосіч**. Арганізатары прасілі дазволіць пікет у цэнтры гораду, улады ж безальтэрнатыўна прапанавалі пікетаваць у парку Мазурына — фактычна ў лесапарку на ўскрайку гораду. Міжнародны дзень правоў чалавека ва ўсім сьвеце адзначаецца 10 сьнежня.

**СП**



ГАННА ІЛЬІНА

# Першая беларуская група за сем гадоў

Трэцяга сьнежня. Восьмая гадзіна раніцы — пачатак працоўнага ды навучальнага дня. Трэцяга сьнежня а восьмай гадзіне распачынае працу беларускамоўная група ў адным зь дзіцячых садкоў Магілёва. На сёньня ў гэтым гурце толькі тры маленькія чалавечкі, якія і будуць чытаць беларускія кніжкі ды вучыць беларускія вершы.

Адкрыцьцё прызначанае на самую раніцу. У адным з пакояў саду зьбіраюцца дзеці, іх бацькі, журналісты. Хутка будзе ўрачыста перарэзаная чырвоная стужка.

Кіраўніцтва садка — намесьнікі дырэктара — хвалююцца, стараюцца як мага больш зрабіць для таго, каб пакой выглядаў сапраўды па-беларуску: яны выстаўляюць на паліцах цацкі, якія яны лічаць беларускімі: з арнамэнтам ды саломкай. Адна з выкладчыцаў прынесла і чырвона-зялёны сьцяжок. Доўга спрабавала замацаваць яго на бачным месцы. Сьцяг не паддаваўся націску беларускасьці — і падаў… Падчас адкрыцьця ён незаўважна ляжаў на шафе ля сьцяны. Таксама на паліцах ляжаць беларускамоўныя дзіцячыя кніжкі — іх туды паклалі самі бацькі.

Не зважаючы на прысутнасьць незнаёмых, наяўнасьць фотаапаратаў ды тэлекамэраў, дзеці гуляюць вакол вялікага дому, які прынесла на дзень адкрыцьця адна з выкладчыцаў.

Зьяўляецца прыемная дзяўчына, якую ўсе клічуць Алеся Ўладзімераўна, — менавіта яна і будзе надаваць гурту беларускамоўны кіраўнак.

Маленькая Ялінка адчувае сябе ў садку як дома — яна ходзіць сюды ўжо зь вясны. Хлопчык Паша таксама быў тут, аднак у польскамоўнай групе. Дарэчы, на гэты конт намесьніца дырэктара сказала: «Я была вельмі ўражаная, калі бацька Пашы прыйшоў і сказаў, што лепш аддасьць свайго сына ў беларускую групу, чым у польскую…» — яна выдала гэта з такой інтанацыяй, што ўсе прысутныя ледзь не паверылі ў тое, што беларуская мова зьяўляецца для нас замежнай. Аднак пасьля яна аптымістычна дадала: «Думаю, што хутка ў гэтай групе будзе шмат дзяцей».

Настаў урачысты момант. Алеся Ўладзімераўна ўзяла дзяцей за рукі, яны разам сталі на ўваходзе — і канцы чырвонай стужкі павольна апусьціліся ў розныя бакі.

Бацькі ды выкладчыкі віншавалі адзін аднаго. Камэры вышуквалі цікавыя моманты. Дзеці гулялі самі па сабе.

Настаў час сьнедаць. Малыя паселі вакол стала — гэта іхны першы агульны беларускі сьняданак. Цікава, ці разумеюць яны цяпер урачыстасьць моманту?..

Выдатна бачна, што амаль усе прысутныя дарослыя стаміліся: бацькі ад клопату перад адкрыцьцём, а настаўнікі ад сур’ёзнасьці моманту ды прысутнасьці тэлебачаньня.

Усе паціху разыходзяцца. Толькі Алеся Ўладзімераўна садзіць на калені Ялінку ды чытае разам зь ёй вершыкі на роднай мове. З гэтага дня з магілёўскага садка № 81 беларуская мова будзе чутная далёка.

У Магілёве амаль сем год таму пазакрываліся апошнія беларускамоўныя групы ў дзіцячых садках ды клясы ў школах. З тых часоў не было спробаў аднавіць іх працу. Адкрыцьцё гэтай групы — цалкам перамога тых, хто больш за тры месяцы, абіваючы парогі чыноўніцкіх кабінэтаў, змагаўся за ажыцьцяўленьне сваіх канстытуцыйных правоў. Група распачынае працу дзякуючы дапамозе магілёўскіх суполак Партыі БНФ і арганізацыі ТБМ, руху «За свабоду», бацькам ды выкладчыцы, якая пагадзілася на адказную справу.

**P.S.:** Калі я была маленькай, я, відавочна, ня думала пра тое, на якой мове я размаўляю, чаму менавіта на ёй... Ужо сёньня я ня раз задаю пытаньне сваім бацькам: чаму не навучылі, чаму ня выхавалі беларускай зь дзяцінства?..

Думаю, што, калі Ялінка, Паша і іншыя вырастуць, яны зробяць свой выбар самі. А цяпер бацькі даюць ім магчымасьць у будучыні адчуць сябе часткай нацыі ды гісторыі.

**Ганна Ільіна, Магілёў**

# Нефармат

У дыскусіі вакол факту хаджэньня беларускіх рок-музыкаў у Адміністрацыю сказана ўжо ўсё ці амаль усё. Працягваць яе няма сэнсу. Цікава, аднак, іншае. За апошні час ніводная ініцыятыва альбо заява дэмакратычнай апазыцыі ня выклікала падобнага заўважнага рэзанансу ў грамадзтве.

## Беларускія ўязныя

Напярэдадні візыту лідэраў беларускай апазыцыі ў ЗША зьявіўся іхны зварот да ўраду РБ з прапановай: садзейнічаць замежным інвэстыцыям і скасаваньню на Захадзе сьпісу неўязных чыноўнікаў у абмен на палітычныя паслабленьні ўнутры Беларусі.

Здавалася б, размова ідзе пра лёсавызначальныя рэчы. Дый сам візыт у Вашынгтон такіх вядомых і аўтарытэтных палітыкаў, як Мілінкевіч, Лябедзька, Севярынец і іншыя — падзея не другарадная. Тым ня менш, вялікай дыскусіі ці хаця б актыўнага грамадзкага абмеркаваньня гэты факт ня выклікаў. Пытаньне, зразумела, ня ў тым, чый уплыў на розум людзей (асабліва маладых) большы. Музыкам — музыкава, палітыкам — палітыкава. Як запрапанаваў адзін з удзельнікаў дыскусіі на радыё «Свабода», музыкам ня трэба стасавацца з уладаю, яны павінныя дэлегаваць свае патрабаваньні палітыкам, а ўжо іхная задача — гэтыя патрабаваньні сфармуляваць і давесьці да ўладаў.

І вось яны фармулююць. Мэты, выкладзеныя ў заяве апазыцыі, — самыя высакародныя. Па-першае, трэба вызваліць усіх палітзьняволеных і распачаць працэс дэмакратызацыі ў Беларусі. Па-другое, трэба дбаць аб разьвіцьці эканомікі краіны і аб тым, каб вывесьці яе зь міжнароднай ізаляцыі. Па-трэцяе, фактычна пацьвярджаецца гатовасьць дзеля гэтага весьці дыялёг зь дзяржаўным кіраўніцтвам. Што можна ўсяму гэтаму запярэчыць? Такія мэты застаецца толькі вітаць.

Але ў звычайнага, неабазнанага ў палітыцы чалавека, узьнікаюць іншыя пытаньні. Напрыклад — ці трэба было дэкляраваць заяўленыя мэты яшчэ да пачатку візыту? І да каго скіраваны зварот — сапраўды да беларускіх чыноўнікаў? Але ж аўтары зьбіраліся на перамовы не ў прэзыдэнцкую адміністрацыю ў Менску, а на сустрэчу з амэрыканскімі кангрэсмэнамі і прадстаўнікамі дзярждэпартамэнту ЗША. Можа, задача палягала на тым, каб лішні раз раззлаваць айчынных чыноўнікаў, якіх у Вашынгтон не запрашаюць? Пахваліцца сваім, так бы мовіць, асобым статусам «уязных»? Калі гэта спроба перацягнуць на свой бок чынавенства, дык спосаб выбраны ня самы эфэктыўны.

А калі гэта спроба неяк паўзьдзейнічаць на амэрыканскіх суразмоўцаў, дык яна выглядае яшчэ больш дзіўнай. Паездкі ў падобным фармаце ня ёсьць афіцыйнымі перамовамі — гэта, хутчэй, акт добрай волі з боку ўраду ЗША, які выказвае праз гэта падтрымку дэмакратычным каштоўнасьцям і апазыцыі, якая гэтыя каштоўнасьці дэкляруе.

## Што гаварыць, калі няма чаго гаварыць

Дарэчы, на той час, калі Мілінкевіч меў статус адзінага кандыдата дэмакратычных сілаў на прэзыдэнты Беларусі, ягоны візыт у Вашынгтон, думаецца, меў бы крыху іншы фармат і значэньне. У гэтай паездцы ён толькі адзін з прадстаўнікоў апазыцыі. Ён і ягоныя спадарожнікі, канечне, маюць магчымасьць выкласьці свой пункт погляду на падзеі ў Беларусі. Гэта немалаважна і пачэсна. Але сур'ёзных палітычных наступстваў сустрэчы ў Вашынгтоне, як ні сумна гэта ўсьведамляць, у Беларусі мець ня будуць. Яны застануцца пазытыўным фактам біяграфіі беларускіх палітыкаў, а таксама палітычнай хронікі нашага часу.

Думаецца, гэта ў значнай ступені ўсьведамляюць і самі ўдзельнікі паездкі.

На каго ж тады быў разьлічаны зварот апазыцыі? Думаецца, у значнай ступені на беларускую грамадзкасьць. Бо працаваць у поўным адрыве ад грамадзкага меркаваньня ня можа ніякая апазыцыя, калі толькі яна не сышла ў глыбокае падпольле. Ну, дык тады й трэба было патлумачыць гэтай самай грамадзкасьці (то бок, нам з вамі), у чым сэнс гэтай паездкі за акіян, што насамрэч можа быць прадметам абмеркаваньня ў Вашынгтоне, чаго можна і чаго ня трэба ад гэтых перамоваў чакаць. А не дэманстраваць уладам РБ уласныя палітычныя мускулы, якіх, на вялікі жаль, за апошні час моцна нарасьціць апазыцыі не ўдалося.

І справа ня ў тым, што замест апазыцыі «сапраўдныя мэты» яе візыту ў Вашынгтон патлумачыць беларускім гледачам БТ. Гэта, безумоўна, будзе — на гэтым палягаюць прапагандысцкія задачы дзяржаўнага тэлебачаньня.

Справа і ня ў тым, што некаторыя лідэры апазыцыі насьцярожана ставяцца да незалежнай прэсы, традыцыйна дзелячы журналістаў на «нашых» і «нянашых» — то бок, тых, хто дазваляе сабе крытычна адзывацца пра дзеяньні апазыцыі і яе лідэраў. Рэцыдывы партыйнага альбо патэрналісцкага падыходу да прэсы будуць жыць, відаць, яшчэ доўга.

Справа, відаць, у тым, што вельмі часта прадстаўнікам апазыцыі проста няма чаго сказаць грамадзтву. Згаданы вышэй зварот — нічым ня горшы і ня лепшы за дзясяткі іншых падобных зваротаў і заяваў, прынятых за апошнія дзесяць—дванаццаць гадоў. У іх могуць быць стылістычныя адрозьненьні, але сутнасьць застаецца адна. Словы вельмі рэдка падмацоўваюцца рэальнымі дзеяньнямі. І гэта ўжо не стылістычныя праблемы. Гэта праблема разыходжаньня паміж словам і справай.

## Віднее...

Вось чаму, між іншага, атаку на «здраднікаў»-рокераў многія ўспрынялі як несправядлівую. Музыкі дзейнічалі, паводле сваёй наіўнасьці, шчыра і адкрыта — замест таго, каб напускаць туману і рабіць выгляд далучаных да высокіх сфэраў і таямніцаў людзей, як гэта прызвычаіліся рабіць палітыкі. І ня толькі палітыкі, але тыя, хто ганарыцца сваёй далучанасьцю да палітыкі, да яе тайных спружынаў і закулісных пертурбацыяў. Гэтак некалі частка савецкай інтэлігенцыі ганарылася сваімі сувязямі з партыйнымі бонзамі,

далучанасьцю да спэцразьмеркавальнікаў і магчымасьцю выяжджаць за мяжу. Сёньня тыя, хто мае больш-менш надзейны тыл за мяжой, магчымасьць рэгулярна адпачываць там, магчымасьць у любую хвіліну зьехаць ці пасылаць туды вучыцца сваіх дзяцей, лічаць сябе ледзьве не духоўнай апазыцыяй і дазваляюць сабе грэбліва ставіцца да астатніх. Напрыклад — да музыкаў, якія ўпарта жадаюць жыць і працаваць менавіта тут, у Беларусі. І пры гэтым яшчэ застаюцца, адрозна ад іхных апанэнтаў, самадастатковымі людзьмі.

Апошнім часам у асяродку апазыцыі пачалі адбывацца пэўныя станоўчыя зрухі. Адным з такіх зрухаў уяўляецца дыскусія паміж кандыдатамі на пасаду старшыні БНФ, якая вялася, паміж іншага, і на сайце «Нашай Нівы». Удзел у адкрытай дыскусіі ў мэдыях прымусіў саміх дыскутантаў гаварыць, па магчымасьці, шчыра і адкрыта пра свае мэты й задачы, сваё бачаньне месца і ролі гэтай арганізацыі, пра неабходнасьць рэфармаваньня. А гэтая тэма вельмі доўга заставалася табу. Тое, што тычылася, здавалася, унутраных праблемаў ПБНФ і асабістых амбіцыяў яе лідэраў, вылілася ў сапраўды шырокую дыскусію пра будучыню нацыянальна-дэмакратычнага руху, пра шляхі дасягненьня мэты. І да гэтай дыскусіі, акрамя непасрэдных удзельнікаў, далучылася вельмі шмат людзей, для каго Фронт усё яшчэ не пусты гук.

Ня тое важна, хто з трох прэтэндэнтаў паказаў сябе больш здатным кіраўніком. Гэта выявіць толькі практыка. Важна тое, што арганізацыя, заснаваная на дэмакратычных прынцыпах, пачала выразна да іх вяртацца, пачала выходзіць з сутарэньняў закуліснае палітыкі на сьвятло грамадзкай дыскусіі. А гэты крок неабходны, заўважым, ня столькі да адраджэньня былога, колькі да стварэньня новага. Для пераходу ад заўсёднага спадзяваньня на «чужога дзядзьку» да нармальнай, дарослай і самадастатковай палітыкі.

**P.S.**

У адным з радыёрэпартажаў (зразумела, не на хвалях Беларускага дзяржаўнага радыё), прысьвечаных сустрэчы дэлегацыі дэмакратычных сілаў з дзяржсакратаром ЗША Кандалізай Райс, адзін з лідэраў апазыцыі з задавальненьнем зазначыў, што ёй не патрэбны быў перакладчык. Бо яна добра ведае расейскую мову. Зразумела, кожны факт ці дэталь заслугоўваюць увагі журналістаў. Не зусім зразумела іншае. Дзеля чаго замежная радыёстанцыя на сваім сайце сярод іншых загалоўкаў дня зьмясьціла гэты: «Райс гаварыла зь беларускімі палітыкамі безь перакладчыка»? Каб нехта падумаў, што амэрыканская дзяржсакратарка нечакана для ўсіх вывучыла беларускую мову?

А калі сур'ёзна — няўжо варта ганарыцца тым, што беларускія палітыкі, якія едуць у замежны вояж на Захад, як правіла, ня ведаюць іншых моваў, акрамя расейскай? Ну, а пра беларускую мову лічаць за лепшае ўвогуле забыцца.

Пытайцеся ў распаўсюднікаў новы нумар




падпісны індэкс 00345

# Высока пастаўленыя сваякі

Бацькі могуць супернічаць, а дзеці міла працуюць пад дахам аднаго ведамства. «НН» раней пісала аб бліскучых дыпляматычных кар'ерах Захара Навумава, сына міністра ўнутраных справаў, і Андрэя Сухарэнкі, сына былога старшыні КДБ. Поплеч зь імі замежнапалітычныя інтарэсы Беларусі адстойваюць дзеці Макея, Ерына, Лінга, жонкі Камянкова, Сьвержа і многіх іншых высокіх урадоўцаў.


PHOTO.BYMEDIA.NET

«НН» пісала ўжо пра бліскучыя дыпляматычныя кар'еры Захара Навумава, сына міністра ўнутраных справаў РБ, які працуе першым сакратаром пастаяннага прадстаўніцтва пры аддзяленьні ААН у Жэневе, і Андрэя Сухарэнкі, сына былога старшыні КДБ, які на той момант займаў пасаду першага сакратара па пытаньнях Рады Эўропы пры пасольстве Беларусі ў Францыі. Разам з тым, дзеці двух «сілавікоў» далёка не адзіныя сваякі былых і сёньняшніх высокіх чыноўнікаў, які працуюць на дыпляматычнай ніве.

Так, сын Сухарэнкавага папярэдніка Леаніда Ерына Павал зьяўляецца віцэ-консулам у Белай-Падляскай (Польшча). А нашчадак галоўнага памочніка прэзыдэнта Ўладзімера Макея Віталь працуе першым сакратаром пасольства Беларусі ў Аўстрыі. Ён адказны за пытаньні навукі і адукацыі, а таксама за стасункі з МАГАТЭ.

Пры пасольстве Беларусі ва Ўкраіне ёсьць група ў гандлёва-эканамічных пытаньнях, якая адказвае за разьвіцьцё эканамічных сувязяў між нашымі краінамі. Адным з дарадцаў гэтай групы зьяўляецца Сяргей Лінг, сын былога прэм'ер-міністра Беларусі.

Да нядаўняга часу консулам Беларусі ў Швайцарыі быў Ігар Заламай, сын былога старшыні Берасьцейскага аблвыканкаму. Праўда, на дадзены момант ягонага прозьвішча няма ў сьпісах супрацоўнікаў пасольства на афіцыйным сайце.

Сын першага міністра спорту Беларусі Ўладзімера Рыжанкова Максім курыруе ўпраўленьне замежнай палітыкі пры Адміністрацыі прэзыдэнта. Да гэтага Рыжанкоў-малодшы займаў пасаду віцэ-консула пасольства Беларусі ў Ізраілі. У 2005 годзе падчас беларуска-польскага дыпляматычнага скандалу Максім Рыжанкоў быў высланы з Польшчы, ён знаходзіўся там пры пасольстве ў якасьці дарадцы-пасланьніка.

Беларускае пасольства ў Кыргызстане ачольвае Валеры Брылёў — зяць колішняга міністра замежных справаў Івана Антановіча. Праца ў Бішкеку ня першая на дыпляматычнай ніве для Брылёва, ён ужо кіраваў пасольствам Беларусі ў Югаславіі. Гэта прыпала акурат на пэрыяд бамбёжак Белграду НАТАўскімі войскамі.

Яшчэ цэлы шэраг сваякоў высокіх чыноўнікаў працуе ў структурах МЗС, але на сёньня не за мяжой, а ў самой Беларусі. Так, сын генэральнага пракурора краіны (1992—1995) Васіля Шаладонава Ігар — дарадца галоўнага дагаворна-прававога ўпраўленьня. Сын былога намесьніка кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Алега Слукі Юры — намесьнік начальніка консульскага ўпраўленьня, а Дзьмітры Зорын, сын былога міністра лясной гаспадаркі, — дарадца аддзелу Цэнтральнай Азіі і Закаўказьзя.

Начальнік аддзелу фінансаваньня і справаздачнасьці замежных установаў Валютна-фінансавага ўпраўленьня Зінаіда Сьверж — жонка першага намесьніка міністра фінансаў Анатоля Сьвержа. А спадарожніца жыцьця старшыні Вышэйшага гаспадарчага суду Віктара Камянкова Людміла — начальніца Галоўнага дагаворна-прававога ўпраўленьня.

Сярод супрацоўнікаў Міністэрства замежных справаў таксама ёсьць прозьвішчы: Васілевіч, Князеў, Папкоў, Бутэвіч, Казлоў, але нам не ўдалося высьветліць, ці яны таксама сваякі аднайменных чыноўнікаў, ці проста маюць аднолькавыя прозьвішчы. Пэўна ж, у Беларусі ёсьць таленавітыя людзі ня толькі сярод дзяцей міністраў і супрацоўнікаў прэзыдэнтуры.

**Зьміцер Панкавец**

# Дзякуй

**Пятру П.** з Горадні.
**Анатолю П.** зь Менскага раёну.
**К.К.**, **Алегу Дз.**, **Віктару А.** з Магілёва.
**Б.В.** з Баранавіцкага раёну.
**Алесю Н.** са Слуцкага раёну
**В.Е.** са Сьветлагорскага раёну.
**П.Г.** з Мастоўскага раёну.
**Аляксандру З.** з Полацку.
**Дзянісу Р.**, **Канстанціну З.**, **Васілю К.** зь Віцебску.
**Андрэю М.** з Чашніцкага раёну.
**Міхаілу Г.** з Гомельскага раёну.
**Віктару К.** з Гомеля.
**Іне С.**, **Уладзімеру Д.** з Барысаўскага раёну.
**Вячаславу Х.**, **З.К.**, **Але Р.**, **Віктару Б.**, **Міхаілу Ж.**, **Баляславу К.**, **Мікіту З.**, **В.К.**, **С.М.**, **Фёдару К.**, **Ігару С.**, **Альбэрту С.**, **Юр'ю Л.**, **С.Я.**, **Ганьне П.**, **В.Л.**, **Івану А.**, **П.Д.**, **У.Д.**, **Кірылу М.**, **Але В.**, **А.Б.** зь Менску.


з ь б я р ы «К н і г а р н ю «Н а ш а Н і в а»

## Валянцін Тарас. «На высьпе ўспамінаў»




«У сваіх мэмуарах, поўных важкіх дэталяў і трапных апісаньняў, пісьменьнік запрашае нас у прастору, дзе жылі Якуб Колас, Уладзімер Караткевіч, Васіль Быкаў, Яўгенія Янішчыц...

Гэта ўнікальны летапіс быцьця душы, што праходзіць праз вайну і мір, жыцьцё і сьмерць, сяброўства і здраду, напісаны паўзьверх старонак гісторыі СССР, Эўропы, Беларусі...»

**На высьпе ўспамінаў / Валянцін Тарас. — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2007. — 606 с. — (Кнігарня «Наша Ніва»)**


ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

## Як абараніцца ад прымусовай падпіскі

**Добры дзень, шаноўная Рэдакцыя!**

Хачу прапанаваць тэму для абмеркаваньня «Як супрацьстаяць прымусовай падпісцы». Найбольш актуальная яна, вядома, для настаўнікаў. Так, у прыватнасьці, на першае паўгодзьдзе пэдагогам адной зь сярэдніх школаў Менску патрэбна аддаць 75.000 руб. кожнаму. Гэта пры тым, што памер г.зв. «датацыі на падпіску» складае 80 тыс. на год. Атрымліваецца пераплата амаль на 100%. Але ж у выніку сьпіс пэрыядычных выданьняў і, галоўнае, колькасьць асобнікаў, што неабходна выпісаць, рэглямэнтуюцца зьверху. На пэрыёдыку, сапраўды патрэбную для працы, здадзеных грошай звычайна не стае. Канечне, ва ўмовах жорсткай кантрактнай сыстэмы, наўрад ці хто будзе спрачацца і губляць працу праз такую дробязь, як падпіска, але хацелася б пачуць кампэтэнтны адказ праўнікаў: якімі дакумэнтамі рэглямэнтаваная падпіска, на якія законы спасылацца, каб бараніць свае правы, свабоду выбару інфармацыі.

**З павагай В. Л.**

**Камэнтуе намесьнік старшыні Беларускай асацыяцыі журналістаў, праўнік Андрэй Бастунец:** Зь бюджэту настаўнікам выдзяляюцца пэўныя сродкі на набыцьцё неабходнай мэтадычнай літаратуры, што цалкам абгрунтавана. А вось прымусовая падпіска на дзяржаўныя выданьні ня толькі не падмацаваная нівкімі законамі, але й сама па сабе зьяўляецца парушэньнем некалькіх артыкулаў Канстытуцыі. 13-ы артыкул Асноўнага закону гарантуе роўныя ўмовы гаспадараньня для ўсіх формаў уласнасьці і тут мы бачым, што для дзяржаўных выданьняў ствараюцца больш спрыяльныя ўмовы ў сфэры распаўсюду. Гэткае спрыяньне носіць прымусовы характар і, адпаведна, парушае правы асобы ня быць змушанай да выкананьня абавязкаў, не прадугледжаных Законам (арт. 58).

**Запісаў**
**Сямён Печанко**

## Яшчэ пра Антыкамуністычны форум

**Ці мелі штосьці ад хрысціянства крыжовыя паходы і агні інквізыцыі? Хто адсякаў пальцы і мураваў старовераў? Якім чынам хрысьціянізавалі Новы Сьвет? Ці можна такіх катаў называць хрысьціянамі?**

Рэпрэсіі, галадамор і забойствы ў савецкія часы рабілі такія ж самыя людзі, якія рабілі і вышэй сказанае. Не судзі і судзімы ня будзеш — вось выслоўе з Нагорнай казані Хрыста. А наконт прапановы спадара Віталя Рымашэўскага паставіць катам крыжы і зорачкі — цалкам згодны наконт крыжоў. Будуць вашыя грахі як баграніца — выбелю як сьнег, сказана ў Бібліі. І ня нам вырашаць, хто грэшны, а хто праведны. Калі назваліся хрысьціянамі — будзьце імі. Ёсьць у Бібліі толькі так ці не, а астатняе — ад лукавага.

**Кастусь Жукоўскі, Гомель**

## Моладзі прысьвячаю

**У 2001 годзе НН зьмясьціла артыкул С.Дубаўца, у якім ён зьедліва праехаўся па зборшчыках подпісаў за З.Пазьняка.** Мяне, як зборшчыка подпісаў, гэта моцна абурыла, і я напісаў артыкул «Пакуль беларусы будуць займацца самаедствам». Яго не надрукавалі, і я перастаў выпісваць НН (не спадабалася цэнзура). Падпіску я аднавіў пасьля таго, як кіраўнік дзяржавы замахнуўся на апошняе беларускамоўнае выданьне. Зноў выпісваю НН, каб падтрымаць газэту. І зноў пішу пра тое ж «самаедства».

Пра самаедства беларусаў актуальна казаць і сёньня. Надоечы пачуў па радыё «Свабода» заяву Івашкевіча пра тое, што ён не зьбіраецца скакаць пад дудку Мілінкевіча... Здавалася б, час ужо зразумець, што ўсім разам трэба скакаць пад дудку беларускую... Бо да чаго прывёў той кангрэс? Пазбавіў Мілінкевіча лідэрства — і ўсё. Моладзь адчула, што апазыцыя кіруецца агентурай, — таму я на баку моладзі. Ёй я і прысьвячаю свой верш.

ПА ЗАКЛІКУ ПРОДКАЎ

*Прысьвячаецца маладафронтаўцам Беларусі*

Край скуты ня бачыць Фэміда сьляпая.
Гвалт можа краіну ў нябыт прывясьці.
Таму з абаронцамі краю ступаю.
Паклікаў дух прадзедаў зь імі ісьці.

Ахвярна мой крок сіла духа ўздымае
Ў змаганьні за край у пагрозьлівы час.
І крок свой упарта, рашуча трымаю
Дарогай дзядоў, што праклалі для нас.

Жыць вольным у вольнай краіне імкнуся.
Па закліку продкаў змаганьне вяду.
І толькі ў свабоднай ад пут Беларусі
Спакой для душы і для сэрца знайду.

**Мікола Валошчык, Белаазёрск**

# Беларусь tomorrow

## Напішы, што думаеш, і зьезьдзі ў Эўропу!

Калі табе да 26 гадоў і ты не абыякавы да будучыні Беларусі, то напішы эсэ і адпраў на электронны адрас belradio@mail.ru

**Што пісаць?**

Абяры адну з шасьці тэмаў або можаш пісаць па кожнай:

1. Нацыянальная ідэя
2. Высокія тэхналёгіі
3. Адукацыя
4. Культура
5. Зьнешняя палітыка
6. Палітычны лад краіны

**Колькі часу на роздум?**

На напісаньне эсэ даецца час да 20 сьнежня. Прадугледжаны памер працы — ня больш за 2000 знакаў. Тэматыка у межах буйной тэмы (напрыклад, адукацыя) можа быць якой заўгодна, ад пляну для канкрэтнага ўніверу да глябальнай ацэнкі сыстэмы адукацыі.

**А судзьдзі хто?**

У якасьці судзьдзяў выступяць вядомыя экспэрты ў розных галінах (па адным на кожную тэму).

У іх склад увайшлі:

**Сяргей Панькоўскі** — кандыдат філязофскіх навук, палітоляг, кіраўнік праекту «Наше мнение»

**Раман Якаўлеўскі** — аглядальнік міжнароднага Інтэрнэт-парталу «Wider Europe»

**Уладзімер Мацкевіч** — філёзаф і палітоляг

**Юры Зісер** — старшыня дырэктараў парталу tut.by

**Пётар Марцаў** — стваральнік газэты БДГ, журналіст, бізнэсмэн і аналітык

**Максім Жбанкоў** — кінакрытык, журналіст, выкладчык «Беларускага калегіюму»

**Як перамагчы і куды едзем?**

У выніку экспэрты вызначаюць 6 пераможцаў: па адным на кожную тэму. У дадатак, паводле вынікаў галасаваньняў вызначаюцца яшчэ 2, за працы якіх было аддана больш за ўсё галасоў. Гэтыя 8 асобаў паедуць ў 4-дзённае падарожжа па Польшчы, дзе сустрэнуцца з палітыкамі, эканамістамі, даведаюцца болей пра польскія рэформы.

І памятайце — чым раней прышлеце працу, тым большая колькасьць чалавек пасьпее за яе прагаласаваць.

Кожны тыдзень у нядзелю на хвалях «Эўрарадыё» і на сайце www.belradio.fm новы праект «Беларусь tomorrow» — цыкль дыскусіяў пра будучыню Беларусі.



## Пальмы ў Вялейцы

**У Вялейцы зьявіліся штучныя пальмы, жоўтыя, салатавыя і чырвоныя.** На пляцы, побач з помнікам Леніну, насупраць банку і гарвыканкаму, а яшчэ каля заводу «Буддэталі». Уначы яны асьвятляюць горад, як ліхтары.

Гэтая падзея, асабліва на фоне недалёкага Новага году, выклікае ў людзей бурную рэакцыю. Хто кажа, што такія пальмы звычайна красуюцца каля казіно, а не на пляцы, хто згадвае пра малпаў, для якіх іх паставілі. Сапраўды, какосы пад сьнегам — гэта незвычайна. Па горадзе лятаюць здагадкі, колькі гэта каштавала, і… калі ж да нас прыедзе прэзыдэнт. Калі згадаць, што ўсім, хто жыве ўздоўж галоўных дарог, паставілі новыя платы, а бальконы некаторых шматпавярховікаў пафарбавалі чырвоным і зялёным колерам…

**Ганна В., Вялейка**

## Не пазнаюць, то папытаюць

**«Тэатар пачынаецца з гардэробу», — казаў знакаміты рэжысэр.**

Ягонае выслоўе прыгадалася днямі, калі чарговы раз наведаў бібліятэку. Не скажу якую, бо гаворку вяду пра рэч больш вузкую, але разьмешчаную акурат насупраць бібліятэчнага гардэробу. Даўжэзны вузкі плякат кідаецца ў вочы — яго не прамінеш, калі кіруесься ў чытальную залю або ў абанэмэнтны аддзел...

Уладзімер Карызна майстравіта паправіў колькі радкоў паэта 30-х гадоў Міхася Клімковіча, «асучасьніў» яго і такім чынам стаўся суаўтарам дзяржаўнага гімну!

Файная практыка!

Спадарове беларускія паэты! Заклікацьму вас на неўзаранае поле клясыкі! Бярэце верш Купалы, Коласа, Багдановіча, Гаруна, Дубоўкі, мяняеце ў ім некалькі радкоў (ноў-хаў маё, хоць і падказанае спадаром Карызнам!) і становіцеся суаўтарам клясыка!

Ну, а калі сур'ёзна, дык не разумею, чаму дагэтуль паэтаў унук Максім Клімковіч не падаў у суд або ня плюнуў у вочы спадару Карызну за тое, што той парушыў аўтарскія правы дзеда! Тым болей што тэкст Міхася Клімковіча, досыць арганічны на свой час, выглядае ў Карызнавай рэдактуры як мінімум дэкляратыўным, недарэчным, а месцамі й алягічным.

Мяркуйце самі, шаноўныя чытачы: беларусы — мірныя людзі, але яны ж гэтаксама і ўдзельнікі бітваў за долю, за волю! Аналітычнае вока зробіць яшчэ няма-ла тэксталягічных адкрыцьцяў!

Не дзіўлюся таксама, што не сьпяваюць словы гэткага «шэдэўру», да прыкладу, беларускія футбалісты. Здагадваюся гэтаксама, чаму пад гэткі гімн і ў гэткай безгустоўнай, антыэстэтычнай, савецка-ісламскай экіпіроўцы прайграюцца прэстыжныя спартовыя спаборніцтвы.

Пра іншыя спаборніцтвы на міжнароднай арэне казаць не выпадае наагул...

**Уладзімер Булаўскі, Менск**

* * *

**У камэнтары Рэдакцыі (НН № 42) выказваюцца спадзяваньні на тое, што Севярынец памяняе свае перакананьні, але гэтага ня будзе ніколі.** Як не памяняюць сваіх перакананьняў і тысячы простых савецкіх людзей.

...Пры ўезьдзе ў Капыль зь менскай шашы стаіць непрыкметны крыж, на якім прасьвідраваны (нібыта кулямі прабіты) надпіс — «сьвятая памяць». А побач — шыльда: «Ахвярам рэпрэсій 1920—1980 гадоў. Удзячныя нашчадкі». Узьнікае пытаньне — пра якія рэпрэсіі ідзе гаворка? За што ўдзячныя нашчадкі? І ці скончыліся тыя рэпрэсіі ў 1980-я? На шыльдзе варта было б напісаць: «Чырвоны тэрор. Сталінскі генацыд»...

Што да рэабілітацыі шараговых камуністаў, якія шчыра дбалі пра шчасьце народу (такія, як Алена Скрыган), то ў мяне няма аніякага ім даверу. Тая ж А.Скрыган, калі была сакратаром райкому, ганьбіла «літаратурных уласаўцаў» — Васіля Быкава, Алеся Адамовіча. Жорстка абышлася з маладым супрацоўнікам «Калгасніка Капыльшчыны» Сяргеем Квіткевічам, які насьмеліўся спытаць са старонак раёнкі, чаму гэта начальства не параілася з жыхарамі Капыля, ці варта сьсякаць ніцыя лозы абапал рэчкі Каменкі. На гэта А.Скрыган адказала са старонак «КК», што Сяргей Квіткевіч, маўляў, неразумны ды малы. Той запярэчыў зноў, але пасьля адказу Алены Скрыган хлопцу давялося зьехаць прэч ад роднае хаты.

Чыкіны, Калякіны, Скрыганы... Няма ў мяне ніякай веры гэтым праваднырам... Я ўжо сталы чалавек — мне 63 гады. Але і дагэтуль адчуваю сталёвыя абдымкі КПСС і яе авангарду — КДБ. Сутнасьць камуністычнай ідэі я спасьціг у 1963 г., падчас Хрушчоўскай адлігі, яшчэ на другім курсе. Таму і кінуў камсамольскі білет у печ.

**Віктар Новік, Капыль**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# ВОДГУК

## Дурны міт пра слабасьць апазыцыі

У артыкуле «Ў Беларусі няма передумоваў для зьменаў» (НН за 08.11.2007) эканаміст Аляксандар Чубрык ацэньвае сытуацыю ў краіне як неспрыяльную для пачатку пераўтварэньняў шляхам «зьнізу». У дадатак да сваіх несуцяшальных высноваў ён прыводзіць словы дакладчыка па Беларусі Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы Андрэа Рыгоні. І сам артыкул, і ацэнка сытуацыі Чубрыкам, і словы Андрэа Рыгоні ня ёсьць чымсьці новым для абазнанага ў палітычным становішчы чытача. Незразумела іншае: колькі можна паўтараць дурны міт пра слабасьць апазыцыі? І думка паважанага спадара Рыгоні наўрад ці можа быць у гэтым пытаньні аўтарытэтнай. Ня думаю, што зь ягоным досьведам барацьбы за дэмакратыю ў сучасных беларускіх умовах, дый яшчэ з пэўнай адлегласьці, можна зрабіць больш слушныя высновы, чым на месцы. Рыгоні ліцыць, што беларускае грамадзтва пайшло значна далей за апазыцыю. Цікава — у чым? Можа, у імкненьні да матэрыяльнага дабрабыту? Тут пярэчаньняў няма. Слушная думка. А можа, спадар Рыгоні меў на ўвазе каштоўнасьці іншага кшталту? Як дэмакратыя, свабода, правы чалавека? Дык гэтыя разуменьні дасюль для большасьці зь «беларускага грамадзтва» зьяўляюцца жупелам, вартым пагарды. Ня можа грамадзтва пайсьці далей за апазыцыю, спадар Аляксандар. Бо хібы апазыцыі ёсьць адлюстраваньнем хібаў грамадзтва. Слабасьць апазыцыі, пра якую гаворана ўжо незьлічоную колькасьць разоў, ёсьць адбіткам слабасьці нацыі, нездольнай рэпрадукаваць лідэра, выпрацаваць у сваім «целе» імунітэт у выглядзе маральных каштоўнасьцяў, якія называюцца таксама дэмакратычнымі.

**Алег Мацкевіч, Барысаў**

# Дзякуй, сябры!

Вакзал Брусэль-Паўднёвы — ня самае цёплае месца «эўрапейскай сталіцы». Па вялізным змрачнаватым холе, які прадзімаецца студзеньскімі скразьнякамі, сноўдаюць пасажыры. Каля адной з мармуровых калёнаў стаіць маленькі кіёск праваабарончай арганізацыі «Amnesty International». Большасьць падарожных, заўважыўшы шыльду з выявай сьвечкі, зьвязанай калючым дротам, адводзяць вочы ды сьпяшаюцца далей. Камусьці шкада грошай на ахвяраваньне, іншым бракуе часу, ці проста ўсё роўна. Бэльгія — утульная ды спакойная краіна. Жывучы ў ёй, неяк ня хочацца думаць пра тое, што недзе ў сьвеце існуе несвабода ды прыгнёт.

Валанцёрка «Міжнароднай амністыі» Мілена Трыўер хухае на зьмерзлыя рукі. Нарэшце! Яна радасна падхопліваецца зь месца, калі ля кіёску спыняецца мінак. Ён зь цікавасьцю аглядаецца, дастае з кішэні пару манэтак ды набывае паштоўкі «Міжнароднай амністыі». Мілена нагадвае яму не забыцца запаліць 10 студзеня сьвечку на знак салідарнасьці з усімі тымі людзьмі, чые правы парушаюцца.

10 студзеня ў сьвеце адзначаюць Дзень правоў чалавека. Узгадваюць усіх ахвяраў несвабоды — таксама і беларускіх палітвязьняў, як, зрэшты, і кожнага з нас, каго закранула несправядлівасьць. А мы, са свайго боку, узгадайма ж у гэты дзень тых, хто думае пра нас. Нашых замежных сяброў, якія прыкіпелі сэрцам да Беларусі. Тых, хто ахвяруе свой час, грошы ды сілы, зьбірае подпісы ў нашую падтрымку, стаіць у пікетах, піша пра нас артыкулы, дасылае лісты вязьням у калёніях. Тых, хто не забываецца на нас, і не дае забывацца на нас іншым. Сяброў, якія робяць маленькія і не заўжды заўважныя справы. Нашых спадарожнікаў на шляху да свабоды.

**Алесь Кудрыцкі**




АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

# Каляндар

са здымкамі фатографаў «НН» Юліі Дарашкевіч і Андрэя Лянкевіча.




п ы т а й ц е с я ў н е з а л е ж н ы х р а с п а ў с ю д н і к а ў

## Сьнежань

**1** — Дзень барацьбы са СНІДам.

**3** — 100 гадоў таму (1907) нарадзіўся паэт Рыгор Крушына, першы беларус у Міжнародным ПЭН-цэнтры, супрацоўнік радыё «Свабода», адзін з заснавальнікаў Беларускага інстытуту навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку.

**6** — Дзень незалежнасьці Ірляндыі (85 гадоў таму (1922) Ірляндыя атрымала незалежнасьць ад Злучанага Каралеўства).

**6** — Дзень незалежнасьці Фінляндыі (90 гадоў таму (1917) Фінляндыя атрымала незалежнасьць ад Расеі).

**8** — Сьвята Беззаганнага зачацьця Найсьвяцейшай Панны Марыі ў каталікоў.

**10** — Міжнародны дзень правоў чалавека.

**13** — 100 гадоў з дня нараджэньня сьвятара Мікалая Лапіцкага (1907—1976), настаяцеля першай беларускай царквы на эміграцыі (Рэгенсбург), пад ягоным кіраўніцтвам беларусы таксама збудавалі храм у Саўт-Рывэры (ЗША).

**15** — Дзень літаратуры на эспэранта ( у гэты дзень у 1859 г. у Беластоку нарадзіўся стваральнік мовы эспэранта — Л.Замэнгоф, беларуская мова была адной зь ягоных родных моваў).

**19** — Сьвяты Мікола ў праваслаўных. Гэты сьвяты лічыцца абаронцам дзяцей — яны мусяць атрымаць падарункі ў гэты дзень.

**20** — Сьвята Ахвяраваньня, Эйд аль-Адга (Курбан-байрам) у мусульманаў.

**23** — Фэстывус — сьвята, прыдуманае дзесяць гадоў таму амэрыканскім пісьменьнікам Дэнам О'Кіфам. Сьвяткуецца на Захадзе тымі, каго раздражняе камэрцыялізацыя падрыхтоўкі да Калядаў.

**25** — Божае нараджэньне ў каталікоў.




# Насьценны каляндар «Беларускія мясьціны ў сьвеце»

Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» выпусьціла насьценны перакідны каляндар «Беларускія мясьціны ў сьвеце» / Belarusan Places Around the World.

У каляндар уключаныя фатаздымкі беларускіх цэркваў у Саўт-Рывэры, Брукліне і Рычманд-Гіле (усе — ЗША); Мар’ян-Хаўс і Беларуская бібліятэка-музэй імя Скарыны ў Лёндане, беларускія цэрквы ў Адэлайдзе і Мэльбурне (Аўстралія), курган-помнік у Саўт-Рывэры, Крыж у гонар Тысячагодзьдзя хрысьціянства ў Беларусі.

Укладальнікі календара — Алег і Натальля Гардзіенкі. Фармат календара А3, вялікі.

Пытайцеся ў незалежных распаўсюднікаў, а таксама пунктах продажу незалежнага друку.

# «Свабодны тэатар» уганаравалі прэміяй Французскай Рэспублікі

«Дзейнасьць «Свабоднага тэатру» дэманструе ўпартасьць і цьвёрдасьць актораў перад пагрозамі парушэньня іхных правоў на свабоду выказваньня», — гаворыцца ў рашэньні Нацыянальнай кансультацыйнай камісіі Францыі ў галіне правоў чалавека. Камісія назвала «Свабодны тэатар» зь Беларусі ў ліку пяці арганізацыяў, якія ў 2007 годзе ўзнагароджаныя яе прэміяй.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Вайцюшкевіч агаліўся дзеля мастацтва



Аголены артыст на беларускай сцэне — гэта сэнсацыя. Музыка Зьміцер Вайцюшкевіч правёў фатасэсію ў стылі «ню». Журналістам жа Вайцюшкевіч паказаў усяго некалькі здымкаў, а таксама распавёў пра сваю даўнюю мару…

Зразумела, што артыст правёў дбайны адбор фатаграфіяў — зь іх не зразумела нават, ці ёсьць, прабачце, на музыку ніжняя бялізна.

Вайцюшкевіча ня першага пацягнула ў гэты бок. Аляксей Стокс любіў перад публікай распранугца. Дый Піта Паўлава на «Рок-каранацыі» можна ўзгадаць. А Паліна Смолава й Topless гэтым толькі і бяруць.

Зьміцер жа гэтыя здымкі правёў з мэтай стварэньня партфоліё для аднаго нямецкага спэктаклю. «Назоў спэктаклю й імя рэжысэра назаву, калі можна будзе», — лякан\u0456чна пракамэнтаваў ён і прызнаўся, што сыграць у спэктаклі — ягоная даўняя мара.

## «Крамбамбуля» прэзэнтуе інтэрнэт-сынгл «Дольчэ віта»

«Крамбамбуля» 12 сьнежня зайграе сольны канцэрт у менскім клюбе «Фартуна». Адбудзецца прэм’ера інтэрнэт-сынглу «Дольчэ віта», а таксама прагучаць найлепшыя песьні гурту. У песьні «Дольчэ віта» ў фірмовым іранічным стылі распавядаецца пра жыцьцё звычайнага чалавека і ягоныя мары. Выступ 12 сьнежня ў «Фартуне» атрымаў назву «Зімовы канцэрт». Пачатак а 19-й гадзіне.




## Выйшла кніжка Ірванца ў перакладзе Арлова

У кнізе выбраных твораў аднаго зь лідэраў украінскага постмадэрнізму Аляксандра Ірванца беларускі чытач знойдзе раман-антыўтопію «Роўна/Ровно», скандальнае апавяданьне «Дзень Перамогі», а таксама п’есы. На беларускую мову творы А.Ірванца пераклаў пісьменьнік Уладзімер Арлоў. Чакаюцца прэзэнтацыі з удзелам аўтара і перакладчыка.

**Ул.інф.; Тузін Гітоў**



Алесь Шатэрнік

# Дзёньнік

Цэляфанавы пакет, падрыхтаваны да спаленьня, стаяў у кутку ў сенцах. Нешта пацягнула мяне паглядзець у яго... Піша **Алесь Шатэрнік**.

А што там знаходзіцца?... Сярод сьмецьця старых квіткоў, абрыўкаў газэтаў, знайшоў некалькі здымкаў і нібыта стары сшытак у цьвёрдай каленкоравай вокладцы... Паступова пачаў гартаць, са зьдзіўленьнем адкрываючы сусьвет нечага лёсу... Дзёньнік адкрываецца запісамі пачатку дваццатага стагодзьдзя, на расейскай мове зь цьвёрдымі знакамі... «Его высокоблагородие штабс-капитанъ»...

Гэтакі... Выдадзеныя боты новыя... Пераказана столькі і гэтак далей... Як вынікала з запісаў, падзеі, відаць, разьвіваліся ў Петраградзе. І тым часам, што так ускалыхнулі ўсё XX стагодзьдзе... Свае пачуцьці і стаўленьне да тых акалічнасьцяў уладальнік дзёньніка стараўся выкласьці на паперы... Ды нават у вершаванай форме. Часам мне здавалася, ці сюжэты былі запазычанымі, ці гэта адбывалася сапраўды з нашым героем, цяпер сказаць цяжка, патрэбен час, каб адмыслова дасьледаваць гэтую сытуацыю...

Дзёньнік належаў Альфонсу Міхневічу, з родавага маёнтку Белы Двор, што знаходзіўся ў Лынтупскім павеце і праз чыгунку якога можна было трапіць аж у Ліфляндыю (гэта стала вядома з таго, што ў сшытку былі пазначаныя станцыі і кошт некаторых квіткоў: ...да Друйску — столькі рублёў і іншых)... На пачатку вершаваных запісаў зьвярнуў увагу на верш, прысьвечаны, як мне падалося, падзеям 1905—1917 гадоў:

«Брат мой вернулся с Цусимы…»

Пасьля ішлі запісы пра Дзярждуму і выбары ў яе. Недзе ў сярэдзіне дзёньніка быў перапісаны «Інтэрнацыянал»... Некалькі пратэстных вершаў сацыялдэмакратычнага кірунку, былі вершы і асабістага зьместу, у якіх ён зьвяртаецца да сваёй каханай...

Па дзёньніку, як па падручніку, можна вывучаць гісторыю Краю, лёсы людзей і вынікі пратэстных настрояў. Гэта відаць на лёсе самога Альфонса Міхневіча.

Пазьней ішлі ўжо запісы па-польску, былі захаваныя некалькі дакумэнтаў зь Пячаткай Віленскага краю, «Пагоняй», урыўкам газэты «Віленскія ведамасьці» 1943 г. на літоўскай мове.

Надалей зьяўляюцца паперы савецкага часу: Пастаўскі раён пазначаны ўжо як Маладачанская вобласьць, і трудадні налічаныя за працу ў калгасе «імя Леніна» (нуль цэлых і X дзясятых)... Зьбяднеў і састарэў наш Альфонс Міхневіч, разбураны быў хутар ягоны, родавае гняздо Белы Двор. Відаць, пазьней ён перасяліўся ў невялікую хату, у Трабуцішках, дзе і дажываў свой век... Толькі праяжджаючы праз ручай бачыш некалькі дзічак і месца гэтае, што і цяпер завецца Белы Двор...

Пазьней, як згарэла нашая хата ў Вайшкунах у1996 г., мы прыдбалі гэтую хатку... У гэтай жа хаце, амаль праз адзінаццаць гадоў пасьля набыцьця, вырашыўшы з жонкай навесьці трошкі парадку, мы і сутыкнуліся зь незвычайным лёсам забытага чалавека...

Наступным днём вяртаўся ў Менск, па дарозе слухаў радыё «Рускае Радыё», якое працуе на Прыбалтыку... Ішло даволі вялікае інтэрвію з дэпутатам украінскай Вярхоўнай Рады, камуністам Грачом, які на ўвесь сьвет паліваў брудам памаранчавую рэвалюцыю ва Ўкраіне і абураўся з таго, што вось дэмакраты аб’ядналіся. «Ну, нічога, яны загніваюць, а «камунісьціцкія» ідэі перамагаюць», — казаў ён, пры гэтым чамусьці гаворачы і ад імя праваслаўных Крыма...

**P.S.**

Цікава, што дапамагаў мне ў Трабуцішках падладзіць хату Алесь Гарбуль, мясцовы краязнаўца... Мы нават зь ім накрылі дах у старым сьвірне і разам адлівалі выраблены мною з бэтону партрэт Баляслава Ялавецкага — першага беларускага інжынэра-чыгуначніка, вынаходніка, паводле праекту якога была збудаваная чыгунка — вузкакалейка праз Лынтупы. Прозьвішча ягонае напісанае залатымі літарамі ў Санкт-Пецярбурскай інжынэрнай Акадэміі...

Сёньня раніцаю патэлефанаваў Гарбуль... Я і распавёў яму гісторыю зь дзёньнікам... Пачуўшы прозьвішча Міхневіч, Алесь не ўтрымаўся і перапыніў мяне ды кажа: «Пачакай, пачакай. Гэта ж прозьвішча Алы Эдмундаўны Кезік, а дзявочае яе — Міхневіч... Мо нашчадак які?»

Ала Эдмундаўна прыяжджала да нас у Трабуцішкі паглядзець на бюст Ялавецкага. Ухваліўшы выяву, сказала, што трэба зрабіць урачыстае адкрыцьцё гэтага помніку на станцыі ў Лынтупах, запрасіць гасьцей нават з суседняй Літвы, тым болей што ў жніўні спаўняецца 110 гадоў з дня адкрыцьця Лынтупскай вузкакалейкі...

«Лынтупы калісьці грымелі на цэлы сьвет,» — заўважыла Ала Эдмундаўна, згадаўшы ,што яна ўраджэнка гэтых мясьцінаў.

Вось ужо трэці тэрмін адпрацавала на пасадзе сакратара па ідэалёгіі Пастаўскага раёну... Неаднойчы, відаць, канфліктавала зь мясцовымі дэмакратамі і нават з самім Алесем Гарбылём... Ну, нічога, цяпер паразумеліся... Тым больш, на глебе паважнага стаўленьня да гісторыі роднага краю...

# Юры Вінаградаў: «Калі была Плошча, адчуваўся агонь»

Гутарка з арт-дырэктарам кавярняў «Стары Менск» і «Лондан».

Многія з чытачоў «НН», якія жывуць у Менску, напэўна, ведаюць кавярню «Стары Менск». У маленькім памяшканьні, дзе калісь прадавалі білеты «Спортлато», створаная ўтульная атмасфэра старасьвеччыны: на сьценах — выявы старых менскіх пэйзажаў, на палічцы — беларускія кніжкі, у куфэрку ля ўваходу — цёплыя пледы на той выпадак, калі каму з наведнікаў стане зімна... Афіцыянты-бармэны тут размаўляюць па-беларуску і прафэсійна гатуюць смачную каву. Тут выпісваюць «Нашу Ніву». Тут рэгулярна адбываюцца невялікія, але зьмястоўныя імпрэзы: прэзэнтацыі новых кніг, канцэрты беларускіх выканаўцаў, вечарыны, капусьнікі, фэстывалі... «Стары Менск» — гэта маленькія госьці ў вялікага горады», — сказала пра гэтае месца пісьменьніца Марыя Вайцяшонак.

Бар «Лёндан» таксама невялічкі. Раней тут была абутковая крама. Інтэр'ер — я б сказала, ангельскі па-беларуску. Адметны тым, што тут рэгулярна праводзяцца цікавыя фота- і проста выставы.

Сёньня карэспандэнтка «НН» гутарыць з арт-дырэктарам кавярні «Стары Менск» ды бару «Лондан» спадаром Юр'ем Вінаградавым. Яму 38 гадоў. Ён мае няпоўную сярэднюю адукацыю, сваіх посьпехаў у дызайне і наагул прафэсійнай дзейнасьці дасягнуў самастойна, але з удзячнасьцю ўспамінае школьнага настаўніка. Носіць галіфэ, прывезенае ў 1949 г. з Манчжурыі, і чыста лёнданскую камізэльку.

**Юры Вінаградаў:** Я вельмі не люблю гэтыя новыя словы тыпу арт-дырэктар. Мне больш падабаецца — мастацкі кіраўнік. Жарт, лепей бяз назваў... Ёсьць такі Ю.В. і ёсьць. Мае абавязкі — ад падбору і навучаньня пэрсаналу да афармленьня інтэр'еру і арганізацыі выставаў, фотавыставаў, іншых імпрэзаў.

**«НН»: У «Старым Менску» ўтульная і нязмушаная атмасфэра. Вы самі распрацавалі і ўвасобілі інтэр'ер?**

**ЮВ:** Так, сам. Але, насамрэч, гэта такая лубочная Беларусь. Да таго ж, атрымалася так, што пры рамонце і афармленьні рабочыя троху напартачылі, праз што парушылася пэрспэктыва. Паводле маёй задумкі, павінна было б складацца ўражаньне, што ты ідзеш уздоўж вуліцы пад чыстым небам... Цяпер мне хацелася б зрабіць нешта, дзе Беларусь выяўлялася б сапраўднай.

**«НН»: Што Вы маеце на ўвазе?**

**ЮВ:** Нават Напалеон Орда маляваў руіны. А мне хацелася б узнавіць Беларусь неруінаў, разумееце? Беларусь, якую практычна забылі, якая практычна невядомая. Беларусь, якая сапраўды цікавая. Беларусь людзей, якія памятаюць свой род. Беларусь — гэта ж не мужык-беларус, заўсёды прыніжаны і забіты, якога цяпер імкнуцца яшчэ паставіць на карачкі. Акрамя мужыка заўсёды была і шляхта, гордая, незалежная, сяляне, рамесьнікі.

**«НН»: Вы працуеце ў такім месцы, куды прыходзіць многа людзей. Вы кантактуеце зь імі, можаце судзіць, у які бок дрэйфуе грамадзтва. Зьмены ёсьць? Яны дадаюць Вам пэсымізму ці аптымізму?**

**ЮВ:** Калі была Плошча, адчуваўся нейкі агонь. Цяпер ён затух.

**«НН»: Ня бачыце ніякага пробліску?**

**ЮВ:** Пакуль не. Людзі задавальняюцца чаркай і скваркай, але ня ўсе, і таму надзея ёсьць.

## Шпурляньне дзярма

**«НН»: Жыцьцё складаецца з многіх кавалкаў мазаікі. Можа, большасьць сапраўды думае пра чарку і скварку. Але ж ёсьць яшчэ і літаратура, мастацтва... Як Вы ацэньваеце іх стан?**

**ЮВ:** Сучаснае беларускае мастацтва — суцэльнае шпурляньне дзярма (гэта ня тычыцца тых людзей, якія займаюцца мастацтвам ад душы, а не за грошы). Ёсьць, канечне, нейкія кроплі сапраўднай літаратуры, але асноўнае — дзярмо. Дрыгва, бярозкі, хаткі... Літаратура не адказвае на выклікі сучаснасьці. Ня буду называць прозьвішчаў. Веру, што ёсьць таленавітыя людзі, якія могуць расьсьмяшыць ці давесьці да сьлёз, але я пра іх нічога ня ведаю. Яны папросту ня могуць выдацца, дайсьці да чытача.

**«НН»: Сурова Вы зь літаратурай... А сучаснае выяўленчае мастацтва, зь ім што?**

**ЮВ:** На сьценах Вы бачыце мае работы... Я спрабую шукаць сьвет. Нягледзячы на тое, што адбываецца навокал. Сучаснае выяўленчае мастацтва... Ну, пахадзіце па галерэях, што Вы пабачыце: або эпатаж, удар па вачах (а ўдар па вачах — гэта кепскі ўдар), або зноў сьліні зь бярозкамі... Іншага і быць ня можа. Бо старшыня ня вельмі ўдалага калгасу ня можа быць прэзыдэнтам краіны ўдалых людзей, якіх ведае ўвесь сьвет. Я ўжо некалькі год не хаджу на вакзалы, калі мае знаёмыя — цудоўныя людзі, якія могуць прыносіць карысьць тут — зьяжджаюць. Сьлёзы навяртаюцца... Трыста год адсюль зьяжджаюць лепшыя людзі. І гэта ўсё працягвацца, працягваецца, працягваецца... У той жа Літве людзі, калі зьяжджаюць, то дзеля таго, каб зарабіць і вярнуцца, у нас жа — ня так. Нават я стаў думаць пра тое, каб зьехаць. Але я не хачу зьяжджаць. Зьмены знадворку ня прыйдуць. Трэба рабіць іх самім.

**«НН»: Але хіба гэта ўзаемазьвязана? Калгас калгасам, але творчыя асобы жывуць самі па сабе? У іх свой сьвет, які яны прапануюць чытачам і гледачам.**

**ЮВ:** Але іх ніхто ня бачыць, ніхто пра іх ня знае! Знаюць толькі пра тых, хто згодны абслугоўваць уладу, але ж гэта звычайна ня самыя таленавітыя людзі.

Нядаўна ў Менску прайшоў фільм «V — значыць вэндэта». Я зьдзівіўся, што яго выпусьцілі ў нас. Там была паказаная сытуацыя — абсалютны зьлепак з нашай. І вось людзі ў пэўныя моманты ўставалі і стоячы апладзіравалі...

## Я б'юся, бо б'юся!

**«НН»: Ці можна з гэтага зрабіць выснову, што Вы, праводзячы культурніцкія імпрэзы, спрыяеце таму, каб вывесьці да шырокіх масаў цікавых творцаў?**

**ЮВ:** Тут ёсьць два адказы. Памятаеце, калі ў Партоса пыталіся, чаму ён б'ецца, ён звычайна адказваў: «Б'юся, бо б'юся!» Гэта не маніфэст, гэта ня выклік. Проста такі склад характару, ці што... Але, з другога боку, у мяне ёсьць жаданьне паказаць, што мастацтва можа быць і іншым...

**«НН»: Вам не спрабавалі перашкодзіць? Не было ніякіх праблемаў?**

**ЮВ:** Былі. Наконт маіх ім-



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

прэзаў у «Старым Менску» да мяне прыходзілі і папярэджвалі...

**«НН»: Хто прыходзіў, пра што папярэджваў?**

**ЮВ:** Здагадайцеся з аднаго разу!

**«НН»: І што Вы тады рабілі?**

**ЮВ:** Ну што? Размаўлялі!

**«НН»: Гэтыя прыходы не адштурхнулі Вас ад таго, каб далей займацца арганізацыяй падобных імпрэзаў?**

**ЮВ:** Не. Гэта як пачуццё, як жарсьць. Ты адчуваеш вось тут, у сэрцы, што разгараецца нейкі агеньчык, ты разумееш, што гэта добра, і пачынаеш падкладаць паліва, каб ён разгараўся мацней... І ты працягваеш займацца тым, што лічыш патрэбным. Пры гэтым трэба ўсё прадумаць. Па-першае, каб ніхто не пацярпеў. Па-другое, каб прабалянсаваць на нейкай грані.

**«НН»: Якую апошнюю імпрэзу Вы рабілі ў сваёй кавярні?**

**ЮВ:** У нас выступаў гурт «Рэха». Гэта маё каханьне зь першага погляду. Андрэй Такінданг, афрабеларус, іхны саліст, гаворыць выключна па-беларуску, і ён моцна падрос за год у артыстычным пляне, навучыўся не баяцца публікі. Як і ўсе. Трэба дапамагаць, а не перашкаджаць.

**«НН»: А Вам трэба імпрэзы ўзгадняць з уладамі?**

**ЮВ:** Не. Калі гэта праводзіцца ў рамках кавярні і калі мы не бярэм за гэта грошы, то не.

## Колькі моваў ведае чалавек?

**«НН»: Ці ёсьць у Вас сталыя кліенты? Хто да Вас прыходзіць?**

**ЮВ:** Як мінімум, палавіна тых, хто да нас заходзіць, становіцца сталым наведвальнікам.

**«НН»: Тады пытаньне ад чытачоў: а ці не прадугледжваюцца ў Вас для сталых кліентаў зьніжкі?**

**ЮВ:** Я пра гэта ўжо некалькі год гавару з уласьнікамі. Гэта было б выгадна і нам, і наведвальнікам.

**«НН»: Як наагул складваюцца Вашыя стасункі з уласьнікамі кавярні і бару? Яны прыхільна ставяцца да Вашых маркетынгавых ідэяў?**

**ЮВ:** Прыхільна. Падзяка ім за гэта, і за тое, што гэта наагул адбылося і жыве.

**«НН»: У маркетынгавым пляне беларускасьць — гэта ўдалы ход?**

**ЮВ:** Больш чым.

**«НН»: Афіцыянты ў «Старым Менску» размаўляюць па-беларуску. Гэта, канечне, стварае дадатковую аўру. Вы спэцыяльна падбіралі людзей, якія валодаюць беларускай?**

**ЮВ:** Так склалася не наўмысна. Калі размаўляю з прэтэндэнтам, адразу пытаюся, колькі моваў ведае чалавек. Мне важна, каб чалавек мог паразумецца з турыстамі (толькі сэкс-турыстам уваход у нас забаронены — раней тут нават была адпаведная шыльда). А чалавек, які валодае ангельскай і францускай, зразумела, будзе гаварыць і па-беларуску. Афіцыянты і бармэны ў нас прыходзяць непрафэсіяналамі, яны імі становяцца, часта гэта студэнты, якія хочуць падзарабіць. А моладзь цяпер спрэс дзьвюхмоўная, вось і выходзіць, што зь беларускамоўнымі наведвальнікамі яны размаўляюць па-беларуску.

## Змагаюся з саўком у рэстаранным бізнэсе

**ЮВ:** Так склалася, што я, па натуры досыць самотны і непублічны чалавек, вымушаны працаваць зь людзьмі, быць навідавоку... З адзінаццаці гадоў я жыў з бабуляй і як унук ня быў падарункам. Напрыклад, кінуў школу, недавучыўшыся. У мяне няпоўная сярэдняя адукацыя. Тое, чаму я навучыўся ў прафэсійным пляне, я спасьцігнуў самастойна. У мяне досыць вялікі досьвед працы ў сфэры рэстараннага шоў-бізнэсу — ад пачатку 1990-х. Людзям хацелася свабоды, адарвацца ад саўка... У мяне і каманды, зь якой я працаваў, было сваё ўяўленьне пра свабоду.

У мяне дрэнны характар. Я ня ўмею думаць, але ўмею адчуваць, і гавару заўсёды тое, што адчуваю.

Я змагаюся з саўком, з саўковым «общепитом». Лічу, што людзі, якія ня могуць працаваць па-сучаснаму, па-эўрапейску, не павінныя працаваць у гэтай сфэры.

**Наталка Бабіна**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**ЖЫЦЬЦЁ ЗА ФУТРА. На невялічкай фэрме ў вёсцы Батчы (Кобрыньшчына) разводзяць пясцоў. Зараз іх там жыве дзьвесьце. Большасьць пясцоў будзе забітая электратокам і пойдзе на футры.**

# «Зроблена ў ЭС» — такую марку прапануе ўвесьці Эўракамісія

У бліжэйшы час Эўракамісія з ініцыятывы камісара па ахове здароўя і абароне правоў спажыўцоў Маркаса Кіпрыяну будзе абмяркоўваць, ці ўводзіць адзіную для прадуктаў і напояў спэцыяльную гандлёвую марку «Зроблена ў ЭС».

Галоўная мэта гэтай прапановы — спрашчэньне ідэнтыфікацыі харчовых тавараў, выробленых на тэрыторыі Эўрасаюзу. Маркас Кіпрыяну прапануе таксама скарыстоўваць лэйбл «Зроблена ў ЭС» для прадукцыі, зробленай з выкарыстаньнем імпартнай сыравіны, за выняткам мясных вырабаў. Праект распрацаванай Кіпрыяну заканадаўчай ініцыятывы, якая будзе афіцыйна надрукаваная ў сьнежні гэтага году, па-сутнасьці, не зьяўляецца прынцыпова новым. На думку экспэрта Chatham House Ена Бэга, пытаньне ня ў тым, хто можа выступіць супраць гэтай ініцыятывы, а ў тым, хто ў Старой Эўропе можа яе падтрымаць: «Ніводны сур'ёзны вытворца аніводнай эўрапейскай краіны не адмовіцца ад таго, каб на яго таварах была маркіроўка «Зроблена ў Францыі» альбо «Зроблена ў Італіі ».

Экспэрт ведае, пра што кажа: у 2004 годзе Эўракамісія была вымушаная адмовіцца ад аналягічнай ідэі ў сувязі з рашучай апазыцыяй з боку вытворцаў зь Вялікабрытаніі, Нямеччыны і Нідэрляндаў, а таксама жаданьнем шэрагу іншых сябраў ЭС захаваць нацыянальныя гандлёвыя лэйблы. Гэта ня дзіва, бо словаспалучэньні «нямецкія кілбаскі», «ангельская гарбата» і «швайцарскі сыр» у сьвядомасьці пакупнікоў ужо самі па сабе лэйблы.

У 2004 годзе Нямеччына выставіла наступныя аргумэнты: марка «Зроблена ў Нямеччыне» павінная захавацца, паколькі для спажыўцоў ва ўсім сьвеце гэтая марка «адлюстроўвае высокі ўзровень якасьці». Тады ж немцы адкінулі варыянт суіснаваньня дзьвюх марак — эўрапейскай і германскай, заўважыўшы, што гэта «выкліча блытаніну».

**Год таму Эўракамісія абмяркоўвала прапанову ўвесьці ў Эўропе таварны знак «Not made in China» («Зроблена не ў Кітаі»).**

Тым ня менш, цяпер прадстаўнікі Эўрасаюзу патлумачылі заходнім СМІ, што, агітуючы за адзіны гандлёвы знак, эўракамісар мае намер палепшыць усьпрыняцьце Эўропы як адзінага рынку. А дадатковыя выдаткі і адміністратыўныя фармальнасьці, зь якімі сутыкнуцца ў зьвязку з новым лэйблам нацыянальныя вытворцы, там назвалі «нязначнымі праблемамі».

Кіраўнічы дырэктар агенцыі Brandlab Аляксандар Яроменка лічыць, што надпіс «Зроблена ў ЭС» усё ж даволі выгадны эўрапейскім вытворцам: «Паколькі спажыўцу часьцяком даволі складана зразумець, у якім месцы гэта было выраблена, нашэсьце з краінаў Усходу цяпер ня толькі тавараў, але і прадуктаў харчаваньня, канечне, вельмі палохае эўрапейскага вытворцу». Дастаткова выгодным будзе лэйбал і вытворцам новых краінаў — сябраў ЭС.

Дарэчы, год таму Эўракамісія абмяркоўвала прапанову ўвесьці ў Эўропе таварны знак «Not made in China» («Зроблена не ў Кітаі»). Яго распрацавала разьмешчаная ў Гібральтары кампанія Alvito. Пэкін тады перадаў Эўракамісіі пэтыцыю, у якой заяўлялася, што такое кляйно на вырабах парушае правілы рынку, носіць «дыскрымінацыйны характар» і здольнае выклікаць «істотнае дэзарыентоўнае ўзьдзеяньне» на спажыўцоў у краінах Эўрапейскага Саюзу. Таварны знак так і ня быў зацьверджаны.

Тым ня менш, ідэі ўвядзеньня знаку «Зроблена ў Эўропе» не пакідае галовы эўрапейскага чынавенства, паколькі яна ўпісваецца ў канцэпцыю адзінага рынку Супольнасьці, дзе свабодна абарочваюцца тавары, рабочая сіла і капіталы.

У гэтым пляне лёгіка зразумелая: калі ўніфікаваць заканадаўства і прыбіраць межы, то і нацыянальныя маркі мае сэнс уніфікаваць.

Больш падрабязна марка «made in EU» будзе абмяркоўвацца ў сьнежні гэтага году.

Дадзеная публікацыя падрыхтаваная пры спрыяньні Эўрасаюзу і не абавязкова адлюстроўвае афіцыйны пункт гледжаньня ЭС.
По дадатковую інфармацыю зьвяртайцеся на сайт www.delblr.ec.europa.eu

## На станцыі мэтро «Купалаўская» загінуў чалавек

1 сьнежня на станцыі мэтро «Купалаўская» пад цягнік кінуўся чалавек. Небараку адвезьлі ў шпіталь, дзе ён і памёр праз 40 хвілінаў. Пры ім не было дакумэнтаў. Мужчыну было прыкладна 40—45 гадоў.

## На беларуска-расейскім памежжы зьнікла машына з 20 тонамі сыру

Сыр на суму 116 тысячаў даляраў закупіў расейскі бізнэсовец у Бялынічах, у мясцовым аддзяленьні акцыянэрнага таварыства «Бабушкина крынка». Прыватны прадпрымальнік зь Віцебску на сваім «МАЗе» браўся даставіць тавар у горад Каралёў Маскоўскай вобласьці яшчэ на пачатку гэтага тыдня.

Паводле інфармацыі мытнікаў, машына з сырам пакінула тэрыторыю Беларусі ў суботу і ў той жа дзень прайшла мытны надгляд на Смаленшчыне. Там машыну бачылі апошні раз.

Пошукі зьніклай машыны пакуль не далі вынікаў.

## На трохгадовую дзяўчынку звалілася шафа

Гэта адбылося 28 лістапада ў дзіцячым садку па праспэкце Ракасоўскага. У шафе ляжалі цацкі. У выніку ў малое пералом асновы зводу чэрапа.

Ленінскае РУУС сталіцы праводзіць праверку.

## Сьмяротны аўтаспын

Жыхар Карэлічаў дабіраўся на працу ў Навагрудак. Аўто, якое ён спыніў, трапіла ў аварыю.

Непадалёк ад вёскі Ваўковічы Навагрудзкага раёну а 07:40 легкавік «Сузукі», якім кіравала 33-гадовая жыхарка Карэліцкага раёну, выехаў на сустрэчную паласу і сутыкнуўся з грузавіком «DAF». Удар быў такі моцны, што легкавік літаральна разарвала на кавалкі. У выніку кіроўца з шматлікімі траўмамі была зьмешчаная ў бальніцу. Цяпер яна знаходзіцца ў стабільна цяжкім стане. Жанчына нядаўна выйшла з дэкрэтнага адпачынку, гадуе двух маленькіх дзяцей. Выпадковы мужчына з Карэлічаў, якога яна вырашыла падвезьці ў Наваградак, сканаў на месцы.

Паводле папярэдніх зьвестак прычынай трагедыі стала нядбайнасьць дарожных службаў Карэліцкага і Навагрудзкага раёнаў — дарогу па маршруце Карэлічы—Навагрудак не пасыпалі пяском.

## Гомельскі банкір прайграў грошы банку ў казіно

У адносінах да 26-гадовага спэцыяліста разьліковакасавага цэнтру аднаго з банкаў узбуджаная крымінальная справа па ч.4 арт.211 Крымінальнага кодэксу «Прысваеньне альбо растрата». Гэты супрацоўнік за некалькі месяцаў «экспрапрыяваў» у банку больш за 60 мільёнаў рублёў. Імі ён пакрыў свае пройгрышы ў казіно гораду. Няўдача ў гульні і штурхнула нябогу на падман.

## Дзік напаў на юнака

21-гадовы жыхар вёскі Петухоўка Чавускага раёну раніцай мінулай пятніцы папраставаў у суседняе паселішча празь лес. Там ён убачыў дзіка, які ляжаў на сьнезе. Хлопец падумаў, што жывёліна мёртвая. Падышоў бліжэй, бо дагэтуль ніколі ў жыцьці ня бачыў дзіка. А той дзік накінуўся на яго і паваліў на зямлю. На шчасьце, жывёліна зьбегла. Паранены трапіў у бальніцу. Міліцыя праверыла абставіны здарэньня і знайшла ў тым месцы не адно, а два логавы дзікоў. Калі б да бойкі падключылася яшчэ адна жывёліна, у маладога чалавека не засталося б шанцаў выжыць.

## Ханука

У аўторак пачалося адно з галоўных габрэйскіх сьвятаў — Ханука. Яно будзе доўжыцца восем дзён. Яго называюць «сьвятам агнёў». Габрэі згадваюць у гэтыя дні сваю гістарычную перамогу над элінамі, якая выратавала народ ад асыміляцыі.

## Сьнег у Берасьце ўжо прывезьлі

Лыжная траса з штучным сьнегам зьявіцца ў Берасьці. Тутэйшы клімат не дазваляе ўзімку трымаць у добрым стане лёд на адкрытых хакейных пляцоўках, а нястача сьнегу не дае магчымасьці катацца на лыжах. Спэцыяльнае абсталяваньне для прадукаваньня штучнага сьнегу ўжо даставілі.

## Сырое надвор’е да паўсьнежня

Паводле Рэспубліканскага гідрамэтцэнтру, цёплае надвор’е будзе гаспадарыць яшчэ два тыдні. Тэмпэратура паветра будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 4. Будуць чаргавацца дажджы і мокры сьнег. Дарэчы, цеплыня прагназуецца і на Новы год.

## 3 тысячы майстэрняў па рамонце мабільнікаў у Беларусі засталіся дзьве

З 1 сьнежня права легальна рамантаваць тэлефоны маюць толькі дзьве кампаніі: «Белтэлекам» і ААТ «Ньюлэнд». Яшчэ тры заяўкі знаходзяцца на разглядзе, паведаміла Міністэрства сувязі. У большасьці майстэрняў проста не знайшлося неабходнага для сэртыфікацыі дарагога абсталяваньня.

## Калі б Глеб гуляў за Англію

Найлепшым футбалістам матчу 15-га туру чэмпіянату Англіі «Астан Віла» — «Арсэнал» быў прызнаны беларус Аляксандар Глеб. У камэнтары BBC пасьля гульні было сказана: «У нас да гэтага гульца толькі адзіная прэтэнзія. Яна ў тым, што ён не нарадзіўся брытанцам. Каб Глеб гуляў за нашую зборную, уся Англія была б шчасьлівая». У прэ’мер-лізе Глебаў «Арсэнал» ідзе на першым месцы.

## У Ляйпцыгу ратуюць беларускага хлопчыка

Шпіталь Санкт-Георг (Нямеччына) зьбірае ахвяраваньні на апэрацыі для беларускага хлопчыка Вані Шубарава. У лютым, падчас пажару ў кватэры ў Гомелі, 7-гадовы Ваня атрымаў 50 адсоткаў апёкаў скуры, ягоная сястра загінула. У шпіталь у Ляйпцыгу хлопчыка даставілі 26 лістапада. Дзіцяці, у якога згарэў твар, трэба ня меней за 10 складаных апэрацыяў. Клініка заклікае рабіць ахвяраваньні на банкаўскі рахунак:

Spendenkontonummer 11;
Bankleitzahl 860 205 00;
Kreditinstitut Bank für Sozialwirtschaft AG Leipzig

з заўвагай: Hilfe für schwer brandverletztes Kind.

Нямецкая прэса паведамляе, што дактары змагаюцца за кожны мілімэтар Ваневай скуры. Першымі апэрацыямі спрабавалі выратаваць левую руку і правае вока беларускага хлопчыка. Сродкі на іх ахвяравала таксама грамадзкая арганізацыя «Ein Herz für Kinder».

**Андрэй Белагубаў, СП, ЗП, Буг; інф. АНТ, радыё «Рацыя», naviny.by, «Звязда», СТВ, tut.by, «Спорт-Экспресс»**

# Як патрыятычна сустрэць канец сьвету

Фэльетон Лёліка Ушкіна.

Навіны зь пячоры пад Пензай, дзе замураваліся, чакаючы канца сьвету, беларускія сэктанты, падмываюць на цікавыя роздумы.

Уразіла тое, што вера сэктантаў у хуткі канец сьвету абсалютна не падрывае іхнага даверу да роднага рэжыму, які ідэйна быццам будуецца на дыялектычным прынцыпе: у 2001 г. сярэдні заробак — 120 баксаў, у 2005 г. — 134 і г.д. На днях замураваныя заявілі, што нягледзячы на заскок з апакаліпсісам, любяць бацьку і нават, калі ён асабіста папросіць, кінуць займацца фігнёй.

Такой непадзецкай праявы ляяльнасьці да рэжыму ніколі не назіраў. Падумаў, што тэма эсхаталёгіі можа быць упісаная ў пастуляты дзяржаўнай ідэалёгіі.

Чаму не?

Уявіце сабе, што заўтра на зборах супрацоўнікаў адміністрацыі лідэр абвяшчае, што 3 ліпеня ў нас будзе не традыцыйны парад, а поўны кірдык. Вэртыкалі і працоўным калектывам даюцца інструкцыі — падрыхтавацца да адказнага мерапрыемства і адрапартаваць. Праводзіцца сэлектарка, падчас якой Ён устаўляе пістон адстаюшчым: «Я паўтараю, што кіраўнікі раёнаў, якія 3 ліпеня не адправяцца на той сьвет, будуць мець вельмі жорсткі разгавор. Я нават не выключаю адстаўкі ўраду».

Навіна пра канец сьвету будзе мець акіян пазытыўных наступстваў.

Па-першае, вырашаецца праблема міжнароднага адмоўнага сальда. Напярэдадні канца сьвету — гэтак месяцы за тры — людзі пачнуць прадаваць затанна сваю маёмасьць і пажыткі — таньней нават за кітайскі шырспажыў. Паколькі ў краіне ўсе будуць настроеныя на хуткі каюк, увесь тавар пойдзе на экспарт, які будзе перавышаць аб’ёмы патоку імпарту.

Па-другое, аўтаматычна разрульваецца жыльлёвае пытаньне. Людзі перабіраюцца жыць у зямлянкі і іншыя норы, дзе квадратны мэтар амаль нічога не каштуе. Можна сьмела рапартаваць, што праблема будаўніцтва сацыяльнага жыльля вырашаная. Дарэчы, дэфіцыту цэмэнту таксама.

Нарэшце праблема дзяржаўных субсыдыяў на камуналку. Паколькі людзі чакаюць фіналу эпохі, жывуць на ўсім гатовым — безь сьвятла, без гарачай вады, без каналізацыі — датацыяў можна не даваць.

Натуральна, канец сьвету можа не надысьці. Але гэта дасьць нагоду правесьці чарговае паседжаньне і павесіць усіх фокстэр’ераў на Сідорскага і кампанію. Апошнія прызнаюцца, што нешта наблыталі з датай. Капец сьвету пераносіцца на дзень Х . Фраза — «Я паўтараю, што кіраўнікі раёнаў, якія ў дзень Х не адправяцца на той сьвет будуць мець вельмі жорсткі разгавор. Я нават не выключаю адстаўку ўраду» — абавязковая.

Дарэчы, канец сьвету — добрая нагода запрасіць назіральнікаў з каманды Рушайлы і расейскіх журналюг. Гэта будзе садзейнічаць пашырэньню праўдзівай інфармацыі сярод суседзяў аб сапраўднай сацыяльна-палітычнай сытуацыі ў Беларусі.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Беларускае сафары. Зіма на страўсавай фэрме ў вёсцы Казішча пад Кобрынам.

ВАЛЯНЦІНА АКСАК

трохрадкоўі—2007

# Проста быць тут

***

Рукі,
параненыя ружамі —
кровазьмяшэньне крэўных.

***

Распусьніца
ад дзеяслова «распусьціцца» —
здольнасьць кветкі й жанчыны.

***

Спачатку вершы
расьлі дзеткамі,
а цяпер во — кветкамі.

***

Між маладых паэтак я апынулася,
калі ўжо мела двух сыноў —
вяснова–восеньскі кон.

***

Ты кунегай мяне абыдзеш,
як у застольлі чаркаю
абыходзяць малых і хворых.

***

Сьпёка, сьвятаяньнік ссохлы,
поплаў нат апоўначы не астывае —
пяшчота на прыску.

***

Гартэнзіі — гонар і годнасьць году —
адкрасавалі,
толькі рэтра цяпер — хрызантэмы.

***

Лісьцік пажухлы на ліпе —
як пудра няўмелай рукою
на стомленым твары.

***

Кава гусьцее на дне філіжанкі,
мацнее бальсан у халодным кілішку —
адзінотная восень.

***

Час садзіць туліпаны,
слухаць Бетховена й ехаць —
усьслед за буслямі — у вырай.

***

Радасьць мая,
тужлівы самотны Бэтховэн,
чаму ты маўчыш ад паховінаў мамы?

***

Востраў Сітэ,
караблік на Сене —
чужы, маніторны малюнак.

***

Гішпанія, сэзон карыды скончаны,
а пляжы Коста Брава крывяняць,
як і ў час яго разгару.

***

Гаспадар гатэлю прычастоўвае віном,
твой тост ляціць кудысьці SMSкай,
мой келіх поўніцца цыкутай.

***

Гарбата такая духмяная
і налісьнікі такія пульхныя
ў карчмаркі Гэлі — за Бугам дом.

***

Пірэтрум падстрыгаю,
геленіюм перасаджваю,
а шыпшыне до быць побач зь ёю.

***

Проста быць тут.
Тут проста быць.
Быць тут проста.



**У 2007 годзе, годзе 125-годзьдзя Купалы і Коласа, «НН» штонумар друкуе творы беларускіх паэтаў. У ранейшых нумарах пабачылі сьвет творы Генадзя Бураўкіна, Андруся Храпавіцкага, Юрася Пацюпы, Міхала Анемпадыстава, Сяргея Прылуцкага, Сяргея Сыса, Алеся Макрацова ды іншых аўтараў. Чакаем Вашых твораў.**

# Дыкс, які быў, які ёсьць

*Важна бачыць рэчы гэткімі, якімі яны ёсьць.*
*Нельга маляваць тое, што існуе толькі ва ўяўленьні.*
***Ота Дыкс***


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У сталічным Музэі сучаснага мастацтва адкрылася выстава графікі Ота Дыкса. Гэтая экспазыцыя твораў клясыка экспрэсіянізму сярэдзіны XX ст. арганізаваная менскім Інстытутам імя Гётэ і Інстытутам міжнародных сувязяў Штутгарту.

Славуты цяпер мастак нарадзіўся ў 1891 г. у Цюрынгіі, ля Гера, у пралетарскай сям'і. У 1909 г. ён паступіў у Акадэмію мастацтваў у Дрэздэне, але, як пачалася Першая сусьветная вайна, сышоў добраахвотнікам на фронт. За чатыры гады на Заходнім фронце афіцэр-кулямётчык Дыкс быў узнагароджаны Жалезным крыжам ды іншымі ўзнагародамі. Ён ваяваў шчыра. Ня гэтак праз патрыятычнаге парываньне, як праз сваё ніцшэанства, бо сваім кумірам уважаў вайну за перадумову чалавечага існаваньня. Гэтак праз усю вайну ён і пранес дзьве кнігі, дзьве крыніцы свайго сьветапогляду — Біблію і томік Ніцшэ.

Нават пасьля раненьня ён імкнуўся зноў у бой, запісаўшыся на авіяцыйныя курсы.

Па вайне сам Дыкс тлумачыў сваю ваярскую няўрымсьлівасьць: «Я бачыў, як нехта ззаду мяне раптам упаў і сканаў, зьбіты куляю. І я хацеў гэта бачыць. Я не пацыфіст, вераемна, я проста занадта цікаўны. Я павінен быў бачыць усё гэта — голад, вошай, бруд, жах, ад якога кладуць у штаны. Я сам павінен быў выпрабаваць на сабе ўсе гэтыя жудасныя бяздонныя глыбіні жыцьця. Вось чаму я пайшоў на вайну добраахвотна».

Па вайне Ота Дыкс давучыўся ў Дрэздэнскай акадэміі, скончыў у 1925 яшчэ й Акадэмію мастацтваў у Дзюсэльдорфе. Ад 1927 г. ён стаў і прафэсарам Акадэміі мастацтваў у Дрэздэне.

У тыя гады Дыкс быў блізкі да руху дадаістаў, сымпатызаваў анархічным і нігілістычным настроям. Менавіта тады ён зьвярнуўся да экспрэсіянізму і «новай урэчаўлёнасьці».

У творах Дыкса 1920-х бязьлітасная трапнасьць дэталяў, што мяжуе з фантастычнасьцю, становіцца адметнай рысаю ягонага стылю. Стылю гратэскнага, трагічна пераламанага, часьцяком вычварнага.

Гэткае сьветаадчуваньне ў Дыкса сфармавалася ў вайну. Але ён застаўся па-за палітыкай.

Гэтаксама як і ягоны ўлюбёны Ніцшэ, Дыкс застаўся «па той бок дабра і зла».

І ўласнае творчае крэда ён сфармуляваў у дзёньнікавых запісах напрыканцы вайны: «Што нам насамрэч патрэбна будзе ў будучым, дык гэта фанатычна безстароньні натуралізм, як у Грунэвальда, Босха й Брэйгеля. Нашая задача — урэчавіць твар нашага часу, а як мы яшчэ гэтага можам дасягнуць, як не з дапамогаю рэальнага сьвету!» Перадусім, за вонкавай брутальнасьцю некаторых ягоных вобразаў тоіцца і вялікая прага чалавечнасьці, разуменьне ненармальнасьці свайго часу. Лепшыя творы Дыкса — гэта праграмная эстэтыка памежнага стану, бязьлітаснага выбару. Жыцьцё альбо сьмерць. І таму ягонае аналітычнае, прэпаруючае мастацтва набывае веліч звышдакумэнтальнасьці. Гэта ён пісаў: «Мастакі не павінныя спрабаваць палепшыць сьвет і навяртаць людзей на сваю веру. Яны дзеля гэтага надта мізэрныя. Яны павінныя адно выступаць сьведкамі».

У сёньняшняй выставачнай экспазыцыі Музэю сучаснага мастацтва прадстаўленыя 90 чорна-белых афортаў, створаных Дыксам цягам 1920-х, яшчэ ў часе навучаньня. Аснову экспазыцыі складае графічная нізка «Вайна», што была выйшаўшы ў Бэрліне ў 1924 г. Гэты цыкаль, што складзены з 50 твораў, ёсьць мастацкім сьведчаньнем ваенных жахаў і людзкіх пакутаў, што бязьлітасна зафіксаваў Дыкс.

Частка экспанаваных працаў Дыкса прысьвечаная й драматычнаму лёсу сацыяльных нізоў паваеннага нямецкага грамадзтва.

Выстава будзе трываць да 18 сьнежня. Мо ня кожны глядач стане аматарам творчасьці гэтага мастака, але кожны будзе мець унікальную магчымасьць асабіста пазнаёміцца з адной з самых маштабных мастацкіх зьяваў сярэдзіны XX стагодзьдзя — зь нямецкім экспрэсіянізмам аўтарства Ота Дыкса.

**Сяргей Харэўскі**




## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**7 (пт)** — «Памінальная малітва».
**8 (сб)** — «Дзіўная місіс Сэвідж».
**9 (ндз)** — «Смак яблыка».
**15 (сб), 16 (ндз)** — «Слуга двух гаспадароў».
*ранішнія спэктаклі*
**9 (ндз)** — «Паўлінка».
*малая сцэна*
**8 (сб)** — «Адчыніце Кантралёру!»

### Тэатар юнага гледача

**7 (пт)** — «Мятлік».
**7 (пт), 8(сб)** — «Прыгоды Бібігона».
**8 (сб)** — «Марныя намаганьні каханьня».
**8 (сб)** — «Дарога на Бэтлеем».
**9 (ндз)** — «Спадарыня Мяцеліца».

## ВЫСТАВЫ



### Ускладаньне кветак

**9 сьнежня а 12-й** — ускладаньне кветак **да помніка Максіму Багдановічу каля Опэрнага тэатру**.

### І сьвеціцца зорнае імя Максіма

**7 сьнежня ў літаратурным музэі Максіма Багдановіча (М.Багдановіча, 7а)** адбудзецца літаратурна-мастацкая вечарына «І сьвеціцца зорнае слова Максіма». Вас чакае сустрэча з В.Шніпам, Г.Далідовічам, В.Жуковічам, В.Стралком і іншымі пісьменьнікамі А таксама выступяць дзеці фальклёрнага калектыву цэнтру «Ветразь». **Пачатак а 16-й.**

### «Лісты сябрам: Вільня — Менск»

**Да 18 сьнежня ў Менскай дзяржаўнай гімназіі-каледжы мастацтваў (вул. Камуністычная, 52)** працуе выстава твораў вучняў Нацыянальнай мастацкай школы імя М.Чурлёніса. Нацыянальная мастацкая школа імя М.Чурлёніса — адзіная школа ў Літве, у якой можна атрымаць агульную сярэднюю і мастацкую адукацыю. Дзяцей навучаюць музыцы, мастацтву (жывапіс, графіка, скульптура, дызайн), балету.

### Юбілейная выстава

**Да 22 сьнежня ў малой залі Нацыянальнага мастацкага музэю (вул. Леніна, 12)** працуе **выстава твораў Уладзімера і Тамары Васюкоў** «У згодзе з прасторай» (графіка і кераміка).

### Прэзэнтацыя кнігі Астрыд Ліндгрэн «Малы і Карлсан-з-даху»

Карлсан запрашае на Дзень народзінаў!

Уваходныя ледзяшы, цікавосткі, гульні, сьпевы й забаўкі чакаюць вас **19 сьнежня а 18 гадзіне ў Менскай абласной бібліятэцы імя А. Пушкіна (вул. Гікалы 4)**.

Падрыхтуй сваё віншаваньне Карлсану і не забудзься на фотаапарат, каб займець здымак зь любімым героем.

## КАНЦЭРТЫ

### Фолк-фэст

**8 сьнежня ў малой залі КЗ «Менск» (Кастрычніцкая, 5)** — фолк-фэст з **удзелам «Ліцьвінаў»** (прэзэнтацыя перавыданьня альбомаў «Неба і Зямля» і «5 сакавіка»), **Госьціцы**, **Gud'а** (прэзэнтацыя перавыданьня альбому «Архаічныя абрадавыя сьпевы»). Т: 649-08-88, 766-24-25.

### Новы фільм пра Плошчу

**7 сьнежня ў сядзібе партыі БНФ (пр.Машэрава, 8) а 18-й гадзіне** пачынаецца прэм'ерны паказ фільму Сержука Патаранскага «Ў сьнягах драмае вясна», які распавядае пра падзеі Менскай вясны-2006, час змаганьня беларускага народу за свабоду й справядлівасьць на пляцы Каліноўскага. У імпрэзе, акрамя самога аўтара кінастужкі, возьмуць непасрэдны ўдзел героі Плошчы.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Цягнік на Юму» і «Львы для ягнятак»

Нечаканы новы вэстэрн і сацыяльна-палітычная драма.

**Цягнік на Юму** (3:10 to Yuma)
ЗША, 2007, каляровы, 117 хв.
**Рэжысэр:** Джэймз Мэнгалд
**Ролі выконваюць:** Расэл Кроў, Крысьціян Бэйл, Логан Лермэн, Далас Робэртс, Пітэр Фонда, Бэн Фостэр, Вайнэса Шо
**Жанр:** Вэстэрн
**Адзнака:** 8 (з 10)

Інвалід амэрыканскага войска, зьбяднелы фэрмэр Дэн Эванс згаджаецца за грошы дастравіць арыштаванага кіраўніка банды Бэна Ўэйда да цягніка. Але злачынцы не зьбіраюцца губляць свайго павадыра…

Новы вэстэрн паводле фільму 1957 г. і навэлі Элмэра Леанарда дае новае дыханьне падзабытаму жанру. На пыльных прасторах Дзікага Захаду ізноў усталёўваецца справядлівасьць, а герой аднаўляе закон, калі ўсё супраць яго.

Акцэнт у карціне Джэймза Мэнгальда — псыхалягічны двубой, абвостраны канфлікт дабра й зла. Харызматычны нягоднік Бэн Ўэйд у неахайна-зграбным выкананьні Расэла Кроў амаль на працягу ўсяе стужкі — д'ябал-спакушальнік (які выдатна ведае Біблію, а ў вольны ад забойстваў час няблага малюе). Спакутаваны, схуднелы Крысьціян Бэйл у ролі Дэна Эванса ня мусіў быць героем — але стаецца ім.

Абавязковыя для вэстэрна перастрэлкі аддадзеныя ў фільме пэрсанажам адмоўным — што толькі павышае градус псыхалягічнага шоку і гарантуе ачышчальны фінал.

Сур'ёзны прыклад годнага кіно — і новы крок старога жанру.

**Ільвы для ягнятаў** (Lions for Lambs)
ЗША, 2007, каляровы, 88 хв.
**Рэжысэр:** Робэрт Рэдфард
**Ролі выконваюць:** Робэрт Рэдфард, Мэрыл Стрып, Том Круз, Майкл Пенья, Эндру Гарфілд, Пітэр Бэрг
**Жанр:** Сацыяльна-палітычная драма
**Адзнака:** 6 (з 10)

У той час, як выкладчык паліталёгіі спрабуе зацікавіць лепшага студэнта да грамадзкай дзейнасьці, амбітны палітык апраўдвае новую апэрацыю ў Аўганістане, а былыя вучні прафэсара гінуць на аўганскім плято…

Стужка амэрыканскага актора Робэрта Рэдфарда (які выканаў галоўную ролю) дасьледуе капітуляцыю журналістаў перад індустрыяй забаваў, паўторнасьць мілітарысцкай рыторыкі — і чалавечую абыякавасьць як корань грамадзкага зла.

Карціна Рэдфарда — грунтоўная, сацыяльна-крытычная і зусім не мэйнстрымная. Акторы — сам Рэдфард і Том Круз дакладна малююць варагоўныя грамадзка-палітычныя тыпы. А Мэрыл Стрып, у ролі журналісткі, яшчэ й дазваляе дасьціпную іронію да сваёй папярэдняй «сьцярвознай» гляпмурніцы з «Д'ябла, што носіць «Прада».

Але гэтая палітыка-псыхалягічная стужка будзе цікавая найперш амэрыканцам — дый тое, ня ўсім. Хаця ў расейскім варыянце карціны амаль усе амэрыканскія дакумэнты ў кадры… на рускай мове.

**Андрэй Расінскі**

## КАЛІ Б…

**…сябры беларускага ЦВК былі зайздросьнікамі.**

**Дыктар:** у Чачэніі яўка выбаршчыкаў склала 92 %, зь іх 99 % прагаласавала за партыю Пуціна.



МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

# Юры Вінаградаў: «Калі была Плошча, адчуваўся агонь»

Гутарка з арт-дырэктарам кавярняў «Стары Менск» і «Лёндан». **Старонка 24.**

# Вайцюшкевіч агаліўся дзеля мастацтва

Музыка Зьміцер Вайцюшкевіч правёў фотасэсію ў стылі «ню». Журналістам жа ён распавёў пра даўнюю мару. **Старонка 22.**

## Сустрэчы з «Arche» і «Нашай Нівай» у Слуцку, Салігорску і Берасьці

**13 сьнежня** рэдактар «Arche» Валер Булгакаў, рэдактар «НН» Андрэй Скурко прыедуць у Слуцак і Салігорск. Удзел возьме таксама Валянцін Тарас, які прэзэнтуе кнігу сваіх мэмуараў. **Сустрэча ў Слуцку пачнецца а 18-й.** Даведкі: (029) 690–34–74 (Віталь). **У Салігорску — а 20-й.** Даведкі: 615–10–46 (Павал).

**Увага!** Сустрэча ў Берасьці пераносіцца. Булгакаў, Скурко і пісьменьніца Наталка Бабіна наведаюць **Берасьце 20 сьнежня**. Даведкі: 660–57–41, 724–21–16 (Зьміцер).

Дзякуй за спрыяньне Раісе Жук–Грышкевіч, Кацярыне Вініцкай і Вітаўту Кіпелю.



## А ты падпішыся!

Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву», проста падпішыце дамову. Дэталі — **старонка 17.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### СПАЧУВАНЬНІ

**Трагічна загінуў** Лявон Ладуцька. Выказваем спачуваньне сям'і, блізкім і сябрам.

### КАЛЯДОЎШЧЫКІ

**Шукаем** калядоўшчыкаў для 6–цігадовага ўнука Янкі і ягоных сяброў. Т.: 655–67–99. Мікола

### КАНТАКТЫ

**Сяржук з-пад Воршы!** Кінь красьці ў дамох, дзе цябе прытуляюць. Вярні грошы абрабаванай дзеўцы

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Набор, рэдагаваньне,** інтэрвію, аналітыка, падбор, апрацоўка інфармацыі, матэрыялу, падрыхтоўка рукапісу да друку, пераклад, выдавецкія праекты, распаўсюд. Ластоўскі «Расійска–Крыўскі (беларускі) слоўнік 1924 г, «Наша Ніва» 1906—1908, «Беларускі Кнігазбор». Камплект значак «Гарады Беларусі», аўдыё. Т.: 753–91–96. alesknigi@mail.ru

**Новыя дыскі ад БМА:** Данчык «Беларусачка», Данчык/Барткевіч «Мы адной табе належым», Віктар Шалкевіч «Баляды і рамансы», «Смутны беларускі блюз» і інш. Т.: 649–08–88, 766–24–25, e–mail: w1979@tut.by. Пытайцеся ў музычных крамах і ў незалежных распаўсюднікаў

### КАЦЯНЯТКА

**Аддамо** беларускамяўнае кацянятка ў добрыя рукі. Т.: 798–03–42

### ДОМ

**Прадам** за 62 т. цагляны дом з мансардай, плошчай 110 кв.м. (зроблены на 85 %), побач зь менскай кальцавой. Ёсьць электрычнасьць, вада, падводзіцца газ. Т.: 576–74–29

### БЕЛАРУСКАЯ АГУЧКА

**Творчае згуртаваньне** «Дзіўноты й памароцтвы» з нагоды выхаду новых фільмаў на DVD зь беларускаю агучкаю, ладзіць прэзэнтацыйны прагляд стужак на мове арыгіналу зь беларускімі субтытрамі. Будуць прадэманстраваныя фільмы «300 спартанчукоў» і «Вакацыі спадара Біна». Інфармацыю можна атрымаць па тэлефонах (029) 707–79–89 (Алесь Квіткевіч) і (029) 757–58–67 (Алесь Мазанік), альбо праз e–mail: djp@byDJP.org, mikola@byDJP.org і yuras2006@gmail.com.

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Запрашаем** у падарожжа 21—24 сьнежня па маршруце: Перамышль–Яраслаў–Сандомір (Польшча). Т.: (017) 292–54–58; (029) 622–57–20; 509–12–16; 110–19–28

## ЖАРТ

Ня так страшны чорт, як ягонае ідэалягічнае ўпраўленьне.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Яшчэ пісалася ў абвіцельным акце, што ў «Нашай Долі» была ганьба для Кубанскага войска ў апісаным здарэньні з Валыні, бо карэспандэнт назваў казакоў «чужынцамі».

**«Наша Ніва». №3. 1907**

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф–рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
заснавальнік Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2289. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 05.12.2007.
Замова № 6661.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.